ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

10 КАСТРЫЧНІКА 2013 г. ЧАЦВЕР № 191 (27556) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Якое яно, жыццё пасля размеркавання?

Будзем знаёмыя за... пяць хвілін!

ЦЫТАТА ДНЯ

Сямён ШАПІРА, старшыня Гродзенскага аблвыканкама:

«Турызм у нашай краіне павінен стаць добрай крыніцай прыбытку. Гэта адна з перспектыўных сфер для развіцця рэгіёнаў. На ёй можна і трэба добра зарабляць. Праўда, адной з прычын, якія стрымліваюць з'яўленне новых турыстычных аб'ектаў у нас, з'яўляецца сезоннасць турызму. Так, берагі Аўгустоўскага канала прывабныя для людзей перш за ўсё ў цёплы сезон. Але ў той жа час ёсць і іншыя кірункі. Актыўна развіваецца медыцынскі, аздараўленчы турызм. Узнікаюць аб'екты аграэкатурызму. Дзякуючы льготнаму рэжыму іх на Гродзеншчыне адкрыта ўжо 145. Лічу, што ў нашым рэгіёне аб'ектаў аграэкатурызму павінна быць значна больш, пры гэтым будуць запатрабаваныя. Над гэтым мы ў вобласці будзем сур'ёзна працаваць».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.10.2013 г.

Долар ЗША	9150,00	■
Еўра	12380,00	▼
Рас. руб.	282,50	▼
Укр. грыўня	1117,79	▼

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 9°
Віцебск	+ 7°
Гомель	+ 10°
Гродна	+ 11°
Магілёў	+ 8°
Мінск	+ 9°

ISSN 1990 - 763X

МАЙСТАР ЛАЗОВАЙ МЭБЛІ

Дванаццаць гадоў таму ў вёсцы Лучыцы Петрыкаўскага раёна збіраліся стварыць цэх па вырабе мэблі з лазы. Хацелі даверыць яго работу Аляксею Чарнушэвічу. Але ідэю з розных прычын ажыццявіць не ўдалося. Тады апантаны майстар пачаў займацца лазапляценнем самастойна, ператварыўшы адзін з пакояў свайго дома ў невялікую майстэрню.

Цяпер мэблевыя гарнітуры Чарнушэвіча ведаюць у Мінску, Санкт-Пецярбургу, іншых далёкіх і блізкіх гарадах. Арыгінальныя па форме крэслы ўпрыгожваюць і «Дом паляўнічага» на ўскраіне вёскі.

— Сваімі работамі я сцвярджаю, што лазапляценне як даўняя народная традыцыя вартае захавання і развіцця, — кажа Аляксей Міхайлавіч. — Мой бацька таксама выдатна плёў з лазы. На жаль, у свой час я не імкнуўся спасцігаць гэтае прыгожае і простае рамяство.

Пасля ўдзелу ў 1-м фестывалі этнакультурных традыцый «Покліч Палесся» Аляксей Чарнушэвіч яшчэ з большым натхненнем узяўся за выраб мэблі, спалучаючы звычайную лазу з сінтэтычнаю стужкаю, каб надаць мэблевым вырабам больш сучасны выгляд.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

■ Абітурыент-2014

РЭПЕТЫЦЫЯ ЦТ... НА КАМП'ЮТАРЫ

У кастрычніку ў краіне стартуе першы этап рэпетыцыйнага тэсціравання. Пералік устаноў, дзе «рэпетыцыя» будзе праводзіцца па матэрыялах арганізатараў цэнтралізаванага тэсціравання, можна знайсці на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў. Апрацоўка бланкаў адказаў і падлік вынікаў будуць ажыццяўляцца таксама па тэхналогіях ЦТ. А вось за якасць і змест матэрыялаў тэсціравання, якое праводзіцца іншымі ўстановамі, не згаданымі на сайце, Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў адказнасці не нясе.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Без мабільнікаў і шпаргалак

— Адразу хачу папярэдзіць усіх маладых людзей, якія пажадаюць правесці дыягностыку сваіх ведаў: працэдура правядзення рэпетыцыйнага тэсціравання нічым не адрозніваецца ад цэнтралізаванага тэсціравання. Задача арганізатараў — прытрымлівацца ўсіх правіл правядзення ЦТ, каб адразу настроіць абітурыентаў на сур'ёзны лад і змадэляваць рэальную псіхалагічную абстаноўку правядзення экзамену: прысутнасць мабільнікаў, дапаможнікаў і шпаргалак у экзаменацыйнай аўдыторыі катэгарычна не дапускаецца, — падкрэсліў **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ**. — Арганізатарам дазваляецца кансультаваць удзельнікаў «рэпетыцыі» толькі па тэхналогіі работы над тэстам і па парадку запаўнення бланка, але ніякіх кансультацый па змесце тэстаў...

СТАР. 3

■ Культурныя ўкладанні

БЕЛАРУСКІ ВЕРСАЛЬ АДРЭСТАЎРУЮЦЬ. КАЛІ?

3 мільярды 500 мільёнаў — гэта толькі пачатак

Першы, хто параўнаў жанчыну з кветкай, — паэт, другі — ідыёт. Безумоўна, выконваць апошнюю ролю палымянага жадання няма, але гаварыць будзем зусім не пра жанчын і кветкі. Мільённы раз трэба ўзняць «вечназялёнае». Рэстаўрацыя — гэта праблема. Сонца не спяшаецца ў наша аконца, ці не так? Лёс Версаля. Падумалі пра Парыж? Дарэмна.

Чыстыя факты

Палацава-паркавы комплекс у Свяцку — першы створаны ў пейзажным стылі англійскі парк на Беларусі, які акружаюць азёры (вада з двух верхніх перацякае ў два ніжнія), і шыкоўны палац з бакавымі галерэямі. Плошча гэтай прыгажосці — 12 гектараў.

Помнік архітэктуры і садова-паркавага мастацтва XVIII стагоддзя не адзінокі. Ён — маленькае блізня аднаго сусветнага шэдэўра: ансамбль у Свяцку — малодшы брат парыжскага Версаля. Так, таго самага, які ўвасобіў ідэю абсалютызму эпохі «караля-сонца». Але гутарка ідзе не пра Людовіка XIV, а пра неймаверную папулярнасць каралеўскай рэзідэнцыі: паглядзелі, што прыгожа, — і ў Патсдаме, і ў Вене захацелі тое ж самае. На Беларусі ж аналаг Версаля толькі адзін.

СТАР. 4

ПАТРЭБНЫ НЕАРДЫНАРНЫЯ РАШЭННІ ПА ПЫТАННЯХ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ КРАІНЫ

Аб гэтым кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка заявіў учора на нарадзе па бягучых пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«Гэты год набліжаецца да завяршэння, пачынаецца чацвёрты квартал. Гэта адзіны шанц, скажам адкрыта, выправіць тыя праблемы, якія існуюць. З высокай доляй верагоднасці можна ацаніць вынікі года. З улікам гэтага, магчыма, прыйдзецца некалькі адкарэктаваць тактыку нашых дзеянняў на бліжэйшы час», — заявіў беларускі лідар.

Паводле слоў Прэзідэнта, неабходна паглядзець, наколькі аптымізаваны бягучыя бюджэтныя выдаткі, у тым ліку і дзяржаўныя праграмы, дакладна вызначыць прыярытэты, на якіх варта сканцэнтраваць выдзяленне дзяржаўных сродкаў.

Асобную ўвагу кіраўнік дзяржавы звярнуў на цэны і тарыфы, у тым ліку на жыллёва-камунальныя паслугі, пацікавіўшыся, ці дастаткова ўзважаныя рашэнні, якія прымаюцца ўрадам у гэтай сферы. «Я проста хачу вас, Міхаіл Уладзіміравіч (Мясніковіч. — **Заўвага БЕЛТА.**), і ўрад папярэдзіць: калі пад маркай праблем і цяжкасцяў, якія сёння складаюцца ў краіне, вы хочаце вырашыць даўнія праблемы, а ва ўрадзе, як казаў класік, заўсёды свярбелі рукі ў два-тры разы павялічыць нагрузку на насельніцтва, то гэтая стратэгія памылковая. Нікому не дазволена душыць насельніцтва, і гэта не папулізм», — падкрэсліў Прэзідэнт. «Рост тарыфаў, цэн павінен быць абгрунтаваны і, вядома ж, пакрывацца заробкамі і даходамі нашых людзей. Пра гэта мы ўжо не аднойчы казалі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Пры гэтым Прэзідэнт падкрэсліў, што павышэнне коштаў і тарыфаў, калі гэта неабходна, павінна адбывацца паступова, а не за адзін раз і ў вялікім памеры. «А ў нас так бывае: урад спіць-спіць, прачнуўся праз паўгода і кажа: трэба на 40% нешта павысіць. А па 2-3% вы не маглі, спакойна павышаючы заробкі, павышаць цэны на паслугі і іншае?» — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы таксама запатрабаваў далажыць аб тым, як расстаўлены акцэнты ў грашова-крэдытнай сферы зыходзячы з рэалій сённяшняга дня. Паводле яго слоў, не за гарамі прыняцце найважнейшых дакументаў, якія вызначаюць дзяржаўную сацыяльна-эканамічную палітыку ў наступным годзе. «Я не толькі хачу пачуць, што адбываецца сёння, я гэта бачу і сам, але як гэта будзе перакладзена ў будучы год, што мы будзем мець зыходзячы з сённяшняга дня. Ва ўрада і Нацыянальнага банка прапановы па праектах прагнозу, бюджэту і асноўных напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі ўжо сфарміраваныя. Таму хацелася б пачуць, што новага будзе прапанавана. Як прагназуецца развіццё рэальнага і фінансавага сектараў беларускай эканомікі з улікам вынікаў гэтага года і планаў на будучы?» — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт адзначыў, што адпаведныя пытанні папярэдне разглядаліся экспертамі ў Адміністрацыі Прэзідэнта. У сувязі з гэтым ён пацікавіўся, якія ацэнкі напружанасці намечаных рубяжоў і рэальнасці іх дасягнення. «Майце на ўвазе, што мной дадзена прамое даручэнне нашаму дэпутацкаму корпусу з асаблівай увагай ацаніць будучую эфектыўнасць меркаваных дзяржаўных выдаткаў. Так што чакайце ад дэпутатаў вельмі сур'ёзнай размовы пры прыняцці адпаведных дакументаў», — папярэдзіў беларускі лідар.

Разам з тым Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што сітуацыя ў свеце вельмі няпростая і з гэтым прыходзіцца лічыцца. «Але наракаць увесь час на свет і сусветны крызіс не прыстала. Ад гэтага нам лягчэй не будзе. Асаблівую ўвагу нам трэба надаць рацыянальнаму выкарыстанню фінансавых і іншых рэсурсаў, паўсюднага ўкаранення рэжыму эканоміі і беражлівасці», — лічыць Прэзідэнт.

«У аснову неабходна ставіць галоўнае — захаванне стабільнасці ў фінансавай сферы, збалансаванае развіццё рэальнага сектара эканомікі, павышэнне ўзроўню сацыяльнай абароненасці нашых людзей», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнікі ўрада і Нацыянальнага банка далажылі Прэзідэнту аб асноўных падыходах у сферы сацыяльна-эканамічнага развіцця на канец гэтага года і 2014-га. У іх аснове ляжыць збалансаванае развіццё, мэтазгоднае крэдытаванне эканомікі і якасны рост. Прэзідэнт падтрымаў гэтыя падыходы і адзначыў, што адказнасць за вынікі ўвасаблення гэтай праграмы ў жыццё ляжыць на ўрадзе і Нацыянальным банку.

Кіраўніку дзяржавы таксама былі даложаны чаканыя вынікі выканання бюджэту 2013 года і падыходы па фарміраванні бюджэту наступнага года. Як было адзначана, за кошт пагаршэння знешняй кан'юнктуры рынку адбываецца істотнае недапаступленне даходаў у рэспубліканскі бюджэт. Таму ўрад скарэкціраваў бюджэтную палітыку да канца гэтага года і прапанаваў увесці шэраг абмежаванняў па фінансаванні выдаткаў. Аднак гэтыя абмежаванні не закрануць першачарговых плацяжоў, звязаных з падтрыманнем жыццёвага ўзроўню насельніцтва, з функцыянаваннем самой бюджэтнай сферы.

Жорсткія падыходы, якія былі прапанаваныя ў рамках бюджэтнай карэкціроўкі, падтрыманы кіраўніком дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка ўказаў на неабходнасць паўсюднай эканоміі, большай эфектыўнасці і аддачы ад бюджэтных сродкаў.

Праект бюджэту 2014 года будзе ў бліжэйшы час унесены на разгляд Прэзідэнта.

Віншаванне Прэзідэнта

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі з 35-годдзем архіпастырскага служэння на беларускай зямлі.

«За гэтыя гады Вашымі намаганнямі не толькі адроджана Праваслаўная Царква ў Беларусі, але і адноўлены многія святыні, створана сістэма падрыхтоўкі свяшчэнаслужыцеляў, шырокае развіццё атрымалі багаслоўскія даследаванні, новым зместам насычаецца гуманітарная свецкая адукацыя, — гаворыцца ў віншаванні. — За сваю шматбаковаю дзейнасць Вы ўдастоены звання «Герой Беларусі», што сведчыць не толькі аб прызнанні Вашай працы на ніве захавання і развіцця духоўнай спадчыны, але і аб высокім статусе Беларускай Праваслаўнай Царквы у нашай краіне».

Аляксандр Лукашэнка пажадаў Мітрапаліту Філарэту здароўя, невычэрпных сіл, далейшых поспехаў у архіпастырскім служэнні.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

БАНКІ ЦІКАВЯЦЬ НЕ ТОЛЬКІ ГРОШЫ...

У шосты раз Нацыянальны банк сабраў у Мінску прадстаўнікоў Беларусі, Польшчы, Расіі, Славакіі, Украіны, Літвы на ўжо традыцыйную міжнародную нумізматычную канферэнцыю. Сёлета яна мае назву «Нумізматыка і архітэктура». Тэма выбрана невыпадкова, звярнуў увагу намеснік старшыні праўлення Нацбанка Сяргей Дубкоў. Выявы архітэктурных аб'ектаў прысутнічаюць на многіх беларускіх банкнотах, ім прысвечаны серыі памятных манет. Помнікі архітэктуры з'яўляюцца неад'емнай часткай культурна-гістарычнай спадчыны Беларусі.

Дабрачыннасць

Акрамя таго, банкі краіны праводзяць дабрачынныя мерапрыемствы на карысць архітэктурных помнікаў, музеяў, культурна-патрыятычных фондаў. Напрыклад, Пріорбанк накіраваў 500 млн рублёў на аднаўленне помніка архітэктуры XVI стагоддзя — Любчанскага замка. Белгазпрамбанк аказаў матэрыяльную дапамогу на падтрымку і развіццё музейнай справы, стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы ў суме 512 млн рублёў Нацыянальнаму мастацкаму музею Беларусі, Віцебскаму абласному мастацкаму музею і іншым. У 2014 годзе Белгазпрамбанк плануе выдзеліць яшчэ 898 млн рублёў на падтрымку і развіццё музейнай справы, але канкрэтныя аб'екты пакуль невядомы.

Гістарычная спадчына

Увогуле, Нацыянальны банк «імкнецца кансалідаваць сілы ўсіх зацікаўленых у захаванні і вывучэнні помнікаў гісторыі і культуры і ўяўляе пляцоўку для магчымасці вольнага абмену вопытам, думкамі з калегамі, якія маюць агульныя мэты і задачы», — адзначыў Сяргей Дубкоў. Па яго словах, у першую чаргу дзякуючы супрацоўніцтву з нумізматычнай грамадскасцю музейны фонд Нацыянальнага банка папоўніўся не толькі манетамі, банкнотамі і каштоўнымі паперамі, але і цікавымі фінансавымі дакументамі. «Гэта дазволіла ўдакладніць і адсунуць дату заснавання банкаўскай сістэмы на тэрыторыі Беларусі больш чым на 50 гадоў! Тое, што атрымалася сабраць і захаваць, — гістарычная спадчына нашай краіны», — падкрэсліў прадстаўнік Нацбанка.

Інавацыйная чаканка і манеты да чэмпіянату

Намеснік старшыні праўлення таксама расказаў пра тое, што ў наступным годзе будуць створаны спецыяльныя памятныя манеты да чэмпіянату свету па хакеі. «Нацбанк адбірае прапановы па выпуску такіх памятных манет, — паведаміў Сяргей Дубкоў. — Яны запланаваны ў праекце выпуску манет на наступны год, мы хочам выпусціць іх у прыгожым футляры».

Нацыянальны банк Беларусі ў сувязі з актыўным развіццём нумізматычнага рынку наладжвае кантакты з новымі манетнымі дварамі. Новым партнёрам можа стаць Пражскі манетны двор. Паколькі ў Беларусі няма свайго манетнага двара, памятныя манеты Нацыянальнага банка чаканяцца на манетных дварах розных краін — у прыватнасці, у Літве, Польшчы, Расіі, Германіі, Швейцарыі. «Мы выбіраем найбольш камфортныя ўмовы па фінансах, а таксама заўсёды імкнёмся, каб нашы манеты былі інавацыйнымі», — падкрэсліў Сяргей Дубкоў. Шэраг прызоў, якія атрымалі беларускія манеты на розных конкурсах, звязаны менавіта з інавацыямі ў чаканцы.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

Не лі ваду, стралок, на рыбу

Нацыянальны банк увёў учора ў абарачэнне некалькі новых сярэбраных памятных манет серыі «Знакі задыяка. 2013» — «Рыбы. 2013 (Pisces. 2013)», «Казярог. 2013 (Capricorn. 2013)», «Вадалей. 2013 (Aquarius. 2013)» і «Стралец. 2013 (Sagittarius. 2013)», паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў галоўнага банка краіны.

Усе манеты маюць намінал 20 рублёў, пробу сплаву 925 з пакрыццём золатам пробы 999,9, масу 28,28 грама і дыяметр 41 міліметр. Адчаканены на Манетным двары Польшчы якасцю «пруф» з пазалотай. Тыраж кожнай манеты — да 10 000 штук.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ

ПАЧАЎ ПРАЦАВАЦЬ ТЭЛЕФОН ДАВЕРУ ГАНДЛЁВАЙ ІНСПЕКЦЫІ МІНГАНДЛЮ

Аб парушэннях у рабоце гандлёвых арганізацый, арганізацый грамадскага харчавання або бытавога абслугоўвання можна паведаміць па тэлефоне 8017 200 92 02. Званкі, якія паступаюць на тэлефон даверу, дадуць магчымасць выяўляць недахопы ў рабоце арганізацый.

БЕЛТА.

ГЕНДЫРЭКТАР ВЫМАГАЎ ХАБАР

Учора пры атрыманні хабару ў асабліва буйным памеры з доказамі віны быў затрыманы генеральны дырэктар прадпрыемства «МаналітГрад». Цягам апошніх трох гадоў МУС і УБЭЗ ГУУС Мінгарвыканкама праводзілася праверка фактаў злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, вымагальніцтва і атрымання хабару кіраўніцтвам названага прадпрыемства.

Як паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Міністэрства ўнутраных спраў, падазраваны вымагаў у прадстаўніка камерцыйнай арганізацыі 125 мільёнаў рублёў за своечасовасць плацяжоў па выніках выканання субпадрадных работ у доме жыллёва-будаўнічага спажывецкага кааператыву «Маладосць Міншчыны», які будуецца ў пасёлку Юбілейны Мінскага раёна. Падчас атрымання 95 мільёнаў рублёў з запатрабаванай сумы ён і быў затрыманы.

Гэты дом уваходзіць у лік праблемных і стаіць на кантролі ў рабочай групы, створанай па даручэнні кіраўніка дзяржавы для вывучэння праблемных пытанняў у будаўнічай галіне.

Сёлета МУС разам з УБЭЗ ГУУС Мінгарвыканкама былі задакументаваны аналагічныя факты хабарніцтва. У прыватнасці, генеральны дырэктар ААТ атрымліваў хабар ад таго ж прадстаўніка камерцыйнай структуры ў сакавіку, ліпені і верасні на агульную суму каля 60 мільёнаў рублёў. Грошы прызначаліся за вырашэнне пытанняў па заключэнні дагавора на будаўнічыя работы на ўказаным аб'екце і безнаяўнай аплаце за быццам бы іх выкананне.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ІНФЛЯЦЫЯ Ў ВЕРАСНІ — 1,7%

Індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі сёлета ў верасні склаў у параўнанні са жніўнем 101,7%, паведамілі рэдакцыі ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

У мінулым месяцы гэты індэкс па харчовых таварах склаў 0,6%. Так, мука пшанічная за месяц падаражэла на 6,9%, агародніна — на 3,6%. Сярод нехарчовых тавараў сур'ёзна павялічыўся цэннік толькі на бензін — плюс 14,9%, адзенне і мэбля — толькі на 1%. Платныя паслугі насельніцтву ў верасні падаражэлі на 3,8%, сярод якіх больш за ўсё «прыплюсавала» электразабеспячэнне — на 14%, а вось паслугі дашкольных устаноў нават патаннелі на 8,8%.

Сяргей КУРКАЧ.

ФАКТЫ

І КАШАЛЁК, І НЕРВЫ — НА МЕСЦЫ

У адзін з дзён пасажыры аўтобуса «Неаплан», які прыбыў з Германіі, праходзілі працэдуру мытнага афармлення ў Брэсце.

Пытанняў да пасажыраў не было, дакументы ва ўсіх былі ў парадку, і працэдура прайшла хутка. Пасля таго, як пасажыры селі ў аўтобус і паехалі далей, у зале пункта аўтадарожнага пропуску «Брэст» адзін з памежнікаў заўважыў кашалёк. У ім былі грошы і дакументы на імя грамадзянкі Германіі. Супрацоўнікі пункта пропуску звязаліся па тэлефоне з вадзіцелем аўтобуса. І на наступны дзень няўдачлівая пасажырка вярнулася за сваёй маёмасцю. Як паведамілі ў прэс-службе Брэсцкай памежнай групы, яна засведчыла поўную захаванасць змесціва кашалька, а ў кнізе запісаў пакінула падзяку.

Яна СВЕТАВА.

ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ «КВАДРАТА»



Фота БЕЛТА.

У Віцебску адзначаюць 100-годдзе вядомай карціны Казіміра Малевіча «Чорны квадрат». У абласным краязнаўчым музеі 8 кастрычніка адкрылася выстава карцін, арт-аб'ектаў і інсталяцый удзельнікаў віцебскага творчага аб'яднання «Квадрат» — Галіны і Васіля Васільевых, Аляксандра Малея, Аляксандра Дасужава, Таццяны Макдзяцовай, Аляксандра Слепава, а таксама супрэматыстаў з Мінска Настассі Ганчаровай і Уладзіміра Макаркова.

РЭПЕТЫЦЫЯ ЦТ... НА КАМП'ЮТАРЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Мы сур'ёзна ўзмацняем кантроль і адказнасць як з боку арганізатараў, так і з боку ўдзельнікаў ЦТ за магчымую ўцечку матэрыялаў рэпетыцыйнага тэсціравання за межы экзаменацыйнай аўдыторыі. Зразумела, што наўрад ці хтосьці стане выкарыстоўваць мабільны тэлефон для таго, каб атрымаць на «рэпетыцыі» больш высокі бал. Але некаторыя ўдзельнікі рэпетыцыйнага тэсціравання фатаграфуюць экзаменацыйныя тэсты, каб потым выкласці іх змест у інтэрнэт. І гэтая тэндэнцыя нас вельмі трывожыць. Акрамя таго, што ў такой сітуацыі парушаюцца нашы аўтарскія правы, Рэспубліканскаму інстытуту кантролю ведаў, калі не спыніць такую «самадзейнасць», давядзецца хутка выстаўляць новыя варыянты тэстаў ужо не толькі на кожны з трох раўндаў рэпетыцыйнага тэсціравання, а значна часцей.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Але мы глядзім яшчэ далей: наша задача — не дапусціць неаматываваны выкід экзаменацыйных матэрыялаў у сацыяльныя сеткі падчас правядзення цэнтралізаванага тэсціравання.

Без абмежаванняў

Мікалай Фяськоў патлумачыў, што колькасць дысцыплін, якія можна здаваць на рэпетыцыйным тэсціраванні, у адрозненне ад ЦТ, ніхто не абмяжоўвае. Больш за тое, можна паспрабаваць здаць кожную дысцыпліну нават двойчы, паколькі для кожнага рэпетыцыйнага тура рыхтуюцца два варыянты тэстаў. Таксама да ўдзелу ў рэпетыцыйным тэсціраванні дапускаюцца і дзесяцікласнікі...

Для павышэння эфектыўнасці ад удзелу ў «рэпетыцыі» ЦТ можна скарыстацца паслугамі рэгіянальнага цэнтра тэсціравання і прафесійнай арыентацыі моладзі пры Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я.Купалы, які ўжо не першы год арганізуе пры падтрымцы Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў індывідуальныя кансультацыі для ўдзельнікаў рэпетыцыйнага тэсціравання. Там могуць пракансультаваць любога абітурыента, незалежна ад пункта праходжання тэсціравання і месца яго жыхарства. Мэта такой кансультацыі — ліквідацыя прабелаў у ведах і далейшая падрыхтоўка па тэматыцы тэставых заданняў, з якімі абітурыенты не справіліся на «рэпетыцыі» экзамену.

Індывідуальная кансультацыя ўяўляе сабой рассылку вучэбна-метадычнага пакета, які змяшчае тэматыку раздзелаў школьнай праграмы па кожным няправільна выкананым заданні з указаннем года ці класа вывучэння адпаведнага раздзела, з рэкамендаваным спісам вучэбнай і метадычнай літаратуры, са зместам няправільна выкананых заданняў, правільнымі адказамі і ўказаннем да правільнага рашэння. Індывідуальным кансультаваннем у рэжыме ан-лайн займаюцца і ў Ліцэі БДУ.

...І работа над памылкамі

Таксама Мікалай Фяськоў звярнуў увагу абітурыентаў на камп'ютарнае тэсціраванне, якое праводзіцца ў сценах Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў. Гэта новая форма «рэпетыцыі» будучага ЦТ, якую трэба разглядаць як дадатковую магчымасць «патрэніравацца» напярэдадні адказных іспытаў.

Існуюць тры рэжымы камп'ютарнага тэсціравання. У трэніровачным рэжыме ўдзельнік не абмежаваны ў часе праходжання тэста, а таксама ў любы момант ён можа скарыстацца падказкай камп'ютара. У кантрольным рэжыме на рашэнне тэста адводзіцца такі ж час, як і на ЦТ, і выконваецца ён без падказак. Самы ж набліжаны да ўмоў ЦТ — кантрольны рэжым на бланку: тут таксама абмежаваны час, адсутнічаюць падказкі, але правільныя адказы трэба ўносіць у электронную версію бланка, які цалкам адпавядае арыгіналу бланка ЦТ. Перавага камп'ютарнага тэсціравання ў тым, што абітурыент адразу атрымае свой вынік, а таксама ў яго ёсць магчымасць зрабіць работу над памылкамі, убачыць аўтарскае рашэнне задачы і правільны адказ.

У будныя дні камп'ютарнае тэсціраванне праводзіцца раз на дзень у 14.30, а ў суботу і нядзелю ў інстытуце гатовы тэсціраваць ахвотных і тройчы на дзень — у 9.00, 12.00 і 15.00. Кошт камп'ютарнага тэсціравання такі ж, як і звычайнага рэпетыцыйнага, — 41 800 рублёў. У новым навучальным годзе кошт рэпетыцыйнага тэсціравання крыху павялічыўся, паколькі павялічыліся выдаткі на яго правядзенне.

Тэсты, якія выконваюцца на камп'ютары, адрозніваюцца па змесце заданняў ад тых, якія рыхтуюцца для пунктаў тэсціравання. Таму абітурыенты, якія ўжо прайшлі рэпетыцыйнае тэсціраванне, могуць яшчэ раз праверыць свае веды ўжо на камп'ютары. Зарэгістравацца для праходжання камп'ютарнага тэсціравання можна на сайце РІКВ www.rikc.by ў раздзеле «камп'ютарнае тэсціраванне».

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПЕРАВАГІ КАМП'ЮТАРНАГА ТЭСЦІРАВАННЯ:

— вынік выканання тэста вядомы адразу ж пасля работы над ім;

— магчымасць паўторна выканаць заданні, у якіх будуць дапушчаны памылкі, скарыстаўшыся пры гэтым «падказкай»;

— магчымасць азнаёміцца з аўтарскім рашэннем прапанаваных заданняў.

■ Энергабяспека

ЧАМУ ГРЭЦЦА — «НЕ НАЛЕЖЫЦЬ»?

У Касцюковічах нядаўна вырашылі адключыць ацяпленне на некаторы час: «паспрыяла» надвор'е. Пра гэта расказаў намеснік галоўнага інжынера дзяржпрадпрыемства «Белэнерга» Валерый ПОРШНЕЎ.

— Тэмпература паветра вышэй за 8 градусаў ужо трэція суткі, таму, магчыма, і ў некаторых іншых рэгіёнах будзе вырашана часова адключыць ацяпленне, — адзначыў Валерый Мікалаевіч. Таксама Валерый Поршнеў паведаміў, што запланаваныя графікі рамонтаў цеплатэхнічнага і электратэхнічнага абсталявання на электрастанцыях выкананы. А што датычыць цепласетак, то іх на гэты момант адрамантавана каля 100 кіламетраў.

Асноўным палівам па-ранейшаму з'яўляецца газ. Але існуюць нормы, паводле якіх павінна назапашвацца і рэзервовае паліва — мазут. Акрамя таго, у беларускай энергасістэме ёсць 8 цеплакрыніц, якія працуюць на мясцовых відах паліва (торф, шчапа і інш.). Калі раптам здарыцца скарачэнне паставак энерганосьбітаў, аварыйная сітуацыя ці рэзкае пахаладанне, у «Белэнерга» заўсёды «на ўзбраенні» зацверджаныя варыянты энергазабеспячэння на такія выпадкі.

Абнаўленне закранула не толькі цеплавыя сеткі, але і электрычныя, якіх па лясных масівах нашай краіны працягнута прыкладна 11,5 тысячы кіламетраў. У апошнія гады беларускія энергетыкі імкнуцца карыстацца новымі правадамі, ізаляванымі. Такім не страшнае наліпанне мокрага снегу ці дотык галінак дрэў, а значыць — змяншаецца верагоднасць аварыі. Ужо замянілі на новыя каля 2 тысяч кіламетраў правадоў. Замена працягваецца і цяпер.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

■ Факт

АДКРЫЛІ ПАШТОВУЮ КРАМУ

Гэта адбылося ў Сусветны дзень пошты ў Брэсце. У памяшканні галоўнага паштамта расчыніла дзверы ўтульная крама для наведвальнікаў.

Тут можна няспешна выбраць паштоўкі і падарункі, якія вам пры жаданні прыгожа запакуюць з сургучнай пячаткай, на якой пазначана: «Прывітанне з Брэста». Філатэлісты атрымалі сапраўдны падарунак: для іх падрыхтаваны цэлы аддзел марак, дзе можна ўважліва іх паглядзець, не перашкаджаючы наведвальнікам з чаргі. «З дапамогай крамы пошта будзе вывучаць попыт і далей удасканальваць і пашыраць пералік сваіх паслуг», — сказала падчас адкрыцця дырэктар Брэсцкага філіяла РУП «Белпошта» Валянціна Пух.

Яна СВЕТАВА

■

МТБанк

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2013 г.

Наименование банка: ЗАО «МТБанк», г. Минск

в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование статьи	Символ	П-т поясн. записки	2013 г.	2012 г.
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		290 954,8	169 466,7
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		0,0	0,0
4	Средства в Национальном банке	1103		376 307,9	364 467,9
5	Средства в банках	1104		290 693,4	62 684,1
6	Ценные бумаги	1105		246 064,9	115 790,9
7	Кредиты клиентам	1106		3 046 138,3	1 784 241,2
8	Производные финансовые активы	1107		-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		243,9	243,9
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		86 885,7	49 749,4
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110		345,9	8,7
12	Прочие активы	1111		94 932,5	61 598,8
13	**ИТОГО активы**	**11**		**4 432 567,3**	**2 608 251,6**
14	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
15	Средства Национального банка	1201		-	33 668,1
16	Средства банков	1202		796 265,3	385 790,4
17	Средства клиентов	1203		2 908 897,1	1 759 121,6
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		241 509,3	110 530,4
19	Производные финансовые обязательства	1205		-	-
20	Прочие обязательства	1206		58 885,6	25 096,9
21	**ВСЕГО обязательства**	**120**		**4 005 557,3**	**2 314 207,4**
22	**КАПИТАЛ**				
23	Уставный фонд	1211		121 857,5	121 857,5
24	Эмиссионный доход	1212		-	-
25	Резервный фонд	1213		17 233,7	12 532,6
26	Фонд переоценки статей баланса	1214		17 978,7	18 796,7
27	Накопленная прибыль	1215		269 940,1	140 857,4
28	**Всего капитал**	**121**		**427 010,0**	**294 044,2**
29	**ИТОГО обязательства и капитал**	**12**		**4 432 567,3**	**2 608 251,6**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ за 3 квартал 2013 года

Наименование банка: ЗАО «МТБанк», г. Минск

в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование статьи	Символ	П-т поясн. записки	2013 г.	2012 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		561 625,4	215 149,5
2	Процентные расходы	2012		411 262,4	143 304,4
3	Чистые процентные доходы	201		150 363,0	71 845,1
4	Комиссионные доходы	2021		300 542,3	163 568,7
5	Комиссионные расходы	2022		37 795,2	11 973,1
6	Чистые комиссионные доходы	202		262 747,1	151 595,6
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		2 144,8	1 284,9
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		41 005,4	29 628,7
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		85,2	293,7
11	Чистые отчисления в резервы	207		93 753,9	57 939,2
12	Прочие доходы	208		33 807,2	11 433,0
13	Операционные расходы	209		197 840,7	116 714,7
14	Прочие расходы	210		35 362,6	18 333,7
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		163 195,5	73 093,4
16	Налог на прибыль	212		23 100,8	5 262,9
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		140 094,7	67 830,5

Руководитель **А.К. Жишкевич**

Главный бухгалтер **В.В. Ермолович**

Дата подписания 7 октября 2013

ЗАО «МТБанк». Лицензия на осуществление банковской деятельности № 13 от 06.05.2013 г. УНП 100394906.

БЕЛАРУСКІ ВЕРСАЛЬ АДРЭСТАЎРУЮЦЬ. КАЛІ?

Парадны бок беларускага Версаля.

«Зорка» фотасесій

Любы гродзенец не дазволіць схлусіць: з гэтым мужчынам фатаграфуюцца абсалютна ўсе. Калі ты быў у Гродне і не сеў яму на калені, ці не абняў яго за плечы, ці не пацалаваў яго ў шчаку, ці не лёг з ім побач, то трэба смела лічыць: ты не быў у Гродне. Калі шчыра, літаральна адзінкі ведаюць, хто ён. Хто гэты бронзавы мужчына, які, размясціўшыся на лаве, глядзіць на бераг Гараднічанкі і на вуліцу Элізы Ажэшкі? Многія лічаць яго за Пятра I. Не, справу маем з італьянскім дойлідам Джузэпэ дэ Сака. Ён, сам з Вероны, і пабудаваў беларускі Версаль.

Галоўны архітэктар Вялікага Княства Літоўскага, італьянец атрымаў замову ад магната Юзафа Валовіча, і ў 1779 годзе жамчужына дойлідства ў стылі барока ўжо стаяла сярод паркаў і азёраў. За 20 кіламетраў ад Гродна.

Раней — хварэлі, цяпер — цалуюцца

Лёс палацава-паркавага ансамбля наўрад ці зайздросны. У канцы XIX стагоддзя беларускі Версаль знайшоў новых гаспадароў: Юзаф Валовіч прайграў Свяцк у більярд.

Але рэальна злыя жарты пачаліся пасля. Наблізіліся 1930-я. Беларускі Версаль згубіў ранейшы статус, набыў новы — стаў наркалагічнай клінікай (прычым адзінай ва ўсёй тагачаснай Польшчы). Плячыстыя мужчыны ў доўгіх плашчах і элегантных шляпах павольна шпацыравалі між азёраў. Свяцк ператварыўся ў вядомае сярод багемных персон месца. Што да звычайных смяротных — уваход ім быў адназначна забаронены.

Значныя змены адбыліся ў Свяцку ў савецкі час, калі тут арганізавалі медыцынскі цэнтр рэабілітацыі хворых на сухоты. Вось у такім выглядзе Свяцк і праіснаваў да нашых дзён: апошні пацыент пакінуў рэзідэнцыю ў 2005 годзе.

А далей часта гучыць: «Джузэпэ дэ Сака ў труне пераварочваецца!» Адны гавораць, што архітэктар не ўзрадаваўся, калі б убачыў цудоўны стан палаца (апошняе пацвярджае фота). Другія гавораць: «Усё гэта дробязі. Італьянец пачаў варушыцца, калі дадумаліся масава кідаць смецце». Паводле слоў мясцовай жыхаркі Святланы Зыгмантовіч, бліскучыя пакеты з-пад чыпсаў, пабітыя бутэлькі з-пад піва, разарваныя пачкі цыгарэт — гэта яшчэ «кветачкі», самае прыстойнае з таго, што ўпрыгожвала ганак беларускага Версаля, каскад азёраў і англійскі парк вакол іх.

На працягу чатырох гадоў палацава-паркавы комплекс фактычна заставаўся нічыйным. Днём з агнём давялося шукаць пакупнікоў. З 2009-га адкрытае акцыянернае таварыства «Азёрны» атрымала гэты архітэктурны ансамбль, і адразу ж жыццё каля Свяцка закіпела. Беларусы актыўна скардзіліся: маўляў, забаранілі не толькі наведваць комплекс, але і нават фатаграфавацца на яго фоне.

Тым не менш вяселлі ехалі: у кожную сонечную суботу — да шасці пар. А што? Дзень вяселля — самы доўгачаканы, самы шчаслівы ў жыцці закаханых. Вядома, успаміны пра яго грэюць душу доўгія гады пасля. Таму факт застаецца фактам: гродзенскія нявесты хочуць цалавацца каля палаца XVIII стагоддзя, і толькі так. А забарона наведваць беларускі Версаль не зрабіла шлюбныя фота больш рэдкімі.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Вольнаму воля

Відаць, апошняе абумовіць будучыню Свяцка пасля рэстаўрацыі. У 2015 годзе некаторыя залы аддадуць пад вяселлі. Актавая зала ператворыцца ў рэстаран. Адно крыло будынка запоўняць шыкоўныя нумары з кандыцыянерамі, інтэрнэтам і многімі іншымі атрыбутамі цывілізацыі. Кабінеты для лячэння і СПА-комплекс размесцяцца ў другім крыле. У гаспадарчых пабудовах, якія датуюцца 1841 годам, адкрыецца кавярня. Адновяць канюшні. Хочаш будзіць — калі ласка, хочаш паляваць — калі ласка, хочаш пікнік — таксама калі ласка. Поле для крыкета і міні-гольфа, веласіпедныя дарожкі — гэта аснова адпачынку. Ці не так?

Сёння праект рэстаўрацыі знаходзіцца на стадыі распрацоўкі. А «першыя ластаўкі» ўжо залятаюць. Гродзенскі гісторык і краязнаўца Ігар Лапеха выявіў істотную памылку. Так, арганізатары плануюць дэмантаваць «ламаны» дах. Маўляў, гэта надбудова савецкіх часоў. Але гісторык стаіць на сваім. І Новы Замак, і музычны флігель, і палацы Сангушак, Сапегаў, Радзівілаў у Гродне, — усе будынкі Джузэпэ дэ Сака маюць мансардны «ламаны» дах, які з'яўляецца адметнасцю эпохі барока.

Пакуль падстаў не верыць арганізатарам няма. Тое, што ўжо ажыццявілі, заслугоўвае пахвалы: чатыры вадаёмы ачысцілі ад смецця і глею, паставілі новыя водапрапускальныя шлюзы, умацавалі берагі, усе стокі зрабілі з дрэва.

Палацава-паркавы комплекс у Свяцку — першы створаны ў пейзажным стылі англійскі парк на Беларусі, які акружаюць азёры (вада з двух верхніх перацякае ў два ніжнія), і шыкоўны палац з бакавымі галерэямі. Плошча гэтай прыгажосці — 12 гектараў.

Рэальны стан беларускага Версаля, калі абысці будынак.

І смех і грэх

Заўсёды ёсць два варожыя лагеры: «за» і «супраць». Як кажуць, класіка жанру. Адны — займаюць бок дасведчаных скептыкаў: «Так-так, а як жа па-іншаму? Колькі шклопакетаў перавядуць! Ламінат. Зараз і да сайдынгу з касітонамі дадумаюцца! Быў мармур, а стаў пластык. А што вам такое, калі што якое? Эканамічна выгадны варыянт. А лезці на ражон ахвотных няма даўно».

Другія ж — гатовы даць лазню першым. Маўляў, зноў ныцікі не задаволены: «Не рэстаўруюць — дрэнна. Рэстаўруюць — яшчэ горш. Карацей, носам круцяць. Гэй, хопіць! Былі руіны — стане акуратнае месца, куды прыемна зайсці, каб паглядзець. Гісторыі жахаў пра газасілікатныя блокі, улюбёныя шклопакеты і многае іншае — у сад». Так, блокі пад штукатуркай ніхто не ўбачыць. Шклопакеты лёгка зрабіць у стылі «а-ля сівая старажытнасць». Таму лютым ворагам «варварскай рэстаўрацыі» дзеля большай гістарычнай ідэнтычнасці можна параіць змагацца з электрычным асвятленнем. Яго ж у 1779-м дакладна не было!

Некаторыя прыгадваюць замак у Мальбарку. Тыя, хто былі там на экскурсіі, заўжды адкрывалі рот, калі даведваліся: «Замак практычна цалкам аднавілі пасля вайны». Відавочна: ніякіх блокаў і модных вокнаў. Ратаваць гісторыю — неймаверна дорага. Няма аніякай розніцы, Германія гэта ці Беларусь. Бурштынавы пакой у Санкт-Пецярбургу таксама можна было аднавіць з пластыку. Шкада, не падказалі.

Пра што сумуем?

Маёнтак Валовічаў — праблема не толькі фінансавая. Так, 3 мільярды 500 мільёнаў беларускіх рублёў патрацілі. Але банкіры ёсць банкіры, і грошы будуць. Пра што сумуем?

Уявіце. Час застывае, нібы спыняецца. Ён павісае разам з вечарам над кветкамі і азёрамі. Шырокія алеі. Глухая цяплынь, залацістая машкара. Засень. Палац. Нават у адбымках дажджу беларускі Версаль рамантычны. Таямнічыя прывіды. Унікальны дух і рамантыка XVIII стагоддзя. Дзе ёй месца? Сёння яна жыве ў колішнім палацы Юзафа Валовіча. Ключавое слова — «сёння», гэта значыць — «пакуль». Як-ніяк заўтра рэзідэнцыя ператворыцца ў «Шматфункцыянальны аздараўленчы комплекс «Свяцк».

Галоўнае — расказваць пра беларускі Версаль родным-знаёмым, не адкладваць на «потым», збірацца, накіроўвацца, спяшацца, ісці, бегчы, ехаць, ляцець.

Маргарыта СІДАР.

СПАБОРНІЦТВА ЗА ЛЮБОЎ СПАЖЫЎЦА

Ці сфарміравалася ў беларусаў нацыянальная брэндавая свядомасць? На гэтае пытанне ўжо цяпер можна безапеляцыйна адказаць «не» ці працягваць разважаць пра яе нядаўняе станаўленне. Абсалютна новая прэмія «Народная марка» абяцае стаць каталізатарам і аўтарытэтным сімвалам спажывецкага прызнання. Каб вызначыць лепшых і ўзнагародзіць іх сваім ухваленнем, беларусам прапануецца адчыніць уласныя шафы са «шкілетамі» спажывецкіх пераваг.

...Кожны вытворца жадае ведаць, чым ён цікавіць (або не) пакупніка-кліента. Прэмія «Народная марка» стане выдатнай нагодай даведацца, наколькі беларускія і замежныя брэнды адпавядаюць густам сваіх спажыўцоў. Перамогі ў 120 намінацыях тавараў і паслуг адлюструюць лепшых, ухваленых народным выбарам уладальнікаў гандлёвых знакаў. Дзеля гэтага кожны ўдзельнік галасавання з 11 лістапада па 8 снежня запоўніць анкету, у якой пазначыць свае брэндавыя перавагі ў кожным з раздзелаў. Аматары цыгарэт пакінуць уласныя думкі пры сабе: катэгорыі «тытунёвая прадукцыя» ў спісе намінацый няма. Дарэчы, думку аднаго чалавека, ці, дакладней, IP-адраса камп'ютара, улічаць толькі аднойчы. Вынікі конкурсу стануць вядомымі 16 студзеня 2014 года на цырымоніі ўзнагароджання. Паглядзець яе можна будзе на тэлеканале «Беларусь-1» у лютым 2014-га.

Пакуль урачыстая трансляцыя чакаецца толькі ў недалёкай перспектыве, рэальная дзейнасць прэміі стартуе ўжо цяпер. Уладальнікі гандлёвых знакаў падаюць на ўдзел заяўкі, што каштуе (трэба заўважыць) 350 USD. Зусім хутка спажыўцы пачнуць ацэньваць, каму яны давяраюць і хто падабаецца найбольш. Дарэчы, матывацыяй не прапусціць гэтую дзею і ўдзячна ёй пасадзейнічаць можа стаць не толькі актыўная грамадзянская пазіцыя, але і магчымасць выйграць добры прыз. За неабыякавасць і думку, то бок запоўненую анкету, арганізатары прэміі ўзнагародзяць сотняй сярэбраных і дзясяткам залатых зліткаў! Крыху пра арганізатараў. У іх якасці — рэкламнае агенцтва «Белая Карона». Дапамагае яму Асацыяцыя рэкламных арганізацый Беларусі і Міністэрства гандлю РБ. Дакладнасць выніковых звестак гарантуе Назіральная рада прэміі ў складзе прадстаўнікоў міністэрстваў, ведамстваў, прафесійных бізнэс-аб'яднанняў і СМІ.

«Для многіх беларускіх вытворцаў унутраны рынак — другасны. І нават не другасны, а другарадны. Гэта крыўдзіць. З пункту погляду тэорыі маркетынгу, фундаментам, асновай, надзеяй у няпростыя часы можа быць толькі ўнутраны рынак. Менавіта таму трэба імкнуцца дасягаць лаяльнасці і любові свайго спажыўца, на што і накіравана мэта новай прэміі, — перакананы былы дацэнт кафедры лагістыкі і цэнавай палітыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Валерый Барадзеня. — Калі зайсці на форумы, то часта можна ўбачыць меркаванні, што беларускае не заўжды добрае. Калі ж мы прыходзім у краму, то мяняем свой погляд і з задавальненнем купляем і выкарыстоўваем беларускую прадукцыю».

Сімвал прэміі «Народная марка», якая сёлета толькі нараджаецца, — стылізаваны пад фігуру чалавека элемент слуцкага пояса. Убіраючы ў сябе моц беларускага характару, прэмія спадзяецца стаць па-сапраўднаму народнай і папулярнай.

Любоў КАСПЯРОВІЧ.

■ Анонс

«Пітбуль» вяртаецца на Радзіму

Знакаміты баец змешаных адзінаборстваў Андрэй Арлоўскі, які 34 гады таму нарадзіўся ў Бабруйску, праз трынаццаць гадоў зноў правядзе бой на Радзіме. Паядынак супраць немца грэчаскага паходжання Андрэаса Краніятакеса адбудзецца 29 лістапада на «Мінск-Арэне».

Гэтая падзея стала магчымай дзякуючы прамоўтарскай кампаніі Fight nights, якая плануе выдаткаваць на турнір 300 тыс. долараў (100 тыс. складзе ганарарны фонд). Арганізатары абяцаюць прадумаць даступную білетную праграму: кошт квіткоў будзе вар'іравацца ад 200 тысяч да пяці мільёнаў рублёў.

За сваю чатырнаццацігадовую кар'еру Арлоўскі, які вядомы на Захадзе пад мянушкай Пітбуль, правёў 31 паядынак, у дваццаці з якіх атрымаў перамогу. Апошні пераможны бой беларус правёў 14 верасня супраць амерыканца Майка Кайла. Дарэчы, у першым раўндзе беларус атрымаў сур'ёзную траўму і большую частку паядынку праводзіў са зламанай сківіцай. Але цяпер, па словах Арлоўскага, яму нічога не перашкаджае зноў выйсці на рынг.

«Я славалюбны чалавек, і па-ранейшаму прагну быць чэмпіёнам, лепшым у сваёй справе, — прызнаецца Андрэй Арлоўскі. — Але не толькі папулярнасць і грошы матывуюць мяне. Напрыклад, на бой у Мінску прыедуць мае сябры з Амерыкі, Азіі і з іншых куткоў свету, дзе мяне ведаюць. І магчымасць паказаць ім Беларусь адыгрывае немалаважную ролю».

Адзначым, што ў 2005 годзе Андрэй Арлоўскі пераехаў у Чыкага, дзе жыве з жонкай і сынам. Але і цяпер Пітбуль нярэдка выходзіць на рынг пад двайным сцягам — амерыканскім і беларускім.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ

■

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

10 КАСТРЫЧНІКА 2013 г.
ЧАЦВЕР
№ 21 (15730)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Будзем знаёмыя

Аляксандр САЛАЎЁЎ:

«МАЁ ЖЫЦЦЁ СЁННЯ — НЕШТА СВЕТЛАЕ, АД ЧАГО ВЫРАСТАЮЦЬ КРЫЛЫ»

Можна сказаць, што мара пра сцэну перадалася яму ў спадчыну ад бацькі, які ў маладосці спяваў. Цяпер сцэнічная прастора стала прафесійнай нішай для Аляксандра Салаўёва. На яго рахунку ўдзел у форумах «Адна зямля», «Белазаўскі акорд», фестывалі беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2009», дзе ўзяў Гран-пры і прыз глядацкіх сімпатый. А сёлета ён прадстаўляў Беларусь на конкурсе «Славянскі базар» і заняў трэцяе месца. Што дапамагае яму ісці наперад? Бадай што цвярозая ацэнка сваіх жаданняў і магчымасцяў, падмацаваных шчырасцю і працавітасцю. Пра сваю сцэнічную загартоўку, жыццёвыя прыярытэты і шчаслівыя сустрэчы Аляксандр расказаў нашаму карэспандэнту.

— Скажыце, эмоцыі пасля «Славянскага базару» ўжо сціхлі?

— Шчыра кажучы, яшчэ не зусім. Сам не да канца ад конкурсу адышоў, і адчуваецца, што інтарэс да мяне яшчэ не страцілі. Я ўвесь час прыгадваю фестывальныя падзеі і разумею: такое здараецца ў жыцці толькі раз!

— Што даў вам конкурс?

— На конкурсе я набыў каласальны вопыт. Збылася мара майго дзяцінства, якая здавалася недасягальнай. Я не планаваў здзяйсняць яе сёлета, але ўсё склалася так, што мне выпаў шанц паспрабаваць свае сілы. Прыемна было, калі падыходзілі людзі і казалі, што ім было не сорамна за Беларусь. Лічу зробленае паспяховым крокам. Перш за ўсё таму, што я заявіў пра сябе. «Славянскі базар» — самая адметная падзея майго жыцця сёлета.

— На рэпетыцыях як ацэньвалі свае шанцы?

— Ведаеце, адчувалася здаровая канкурэнцыя. Мы звярталі ўвагу на тое, як спяваюць іншыя, ацэньвалі свае сілы. Я схлушу, калі скажу, што галоўным было паўдзельнічаць. «Славянскі базар» — не першы конкурс у маёй сцэнічнай біяграфіі. На многіх я займаў першыя месцы, браў Гран-пры, таму, безумоўна, ішоў туды па перамогу.

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

Выпрабавана на сабе

ПАЗНАЁМІЦЦА ЗА... ПЯЦЬ ХВІЛІН,

альбо Чаму становяцца папулярнымі «хуткія спатканні»

У 1999 годзе амерыканцы прыдумалі незвычайны спосаб знаёмства пад назвай «speed dating», або «хуткія спатканні». Сутнасць яго ў наступным. У клубе збіраецца роўная колькасць адзінокіх мужчын і жанчын, якія хочуць знайсці сабе партнёра. Яны рассаджваюцца за столікамі па парах і размаўляюць некалькі хвілін. Потым па гукавым сігнале ўдзельнікі сустрэчы мяняюцца суразмоўцамі.
Колькі часу таму такія «нанавечарынкі» з'явіліся ў Расіі, а нядаўна дайшлі і да нас. Названы спосаб знаёмства прыйшоўся даспадобы беларусам, бо гэта не спатканне «ўслепую», як у інтэрнэце. І ў той жа час такая вочная сустрэча ні да чаго не абавязвае, калі, вядома, працягу знаёмства не пажадаюць самі яго ўдзельнікі.
У Мінску «хуткія спатканні» некалькі змянілі фармат. Узяўшы за аснову ідэю амерыканскіх знаёмстваў, арганізатары сталі імправізаваць. У некаторых клубах дзеля «разагрэву» перад сустрэчамі вучаць танцаваць лацінаамерыканскія танцы, у іншых — удзельнікі гуляюць у рухомыя і інтэлектуальныя гульні. Я вырашыла абысціся без эксперыментаў і зазірнуць на больш традыцыйны і блізкі да арыгінала «спід-дэйтынг»...

«Нашаму клубу амаль два гады, — распавёў кіраўнік аднаго з праектаў «хуткіх спатканняў» у Мінску **Вадзім Судакоў,** — і сустракаемся мы ўжо 52-і раз. За гэты час праз нас прайшло каля тысячы чалавек. Вынікі былі розныя: пары сыходзіліся як на кароткі тэрмін, так і на працяглы. Было нават некалькі вяселляў».

Каб паўдзельнічаць у «хуткіх спатканнях», трэба загадзя звязацца з арганізатарамі. Група фарміруецца з улікам узроставых абмежаванняў. Для дзяўчат гэта 22-27, а для хлопцаў 23-30 гадоў. Калі арганізатары паведамляюць, што група сфарміравана, можна распачынаць падрыхтоўку да «выхаду ў свет». У сярэднім за адзін вечар паміж сабой знаёмяцца 10 пар. На кожную «сустрэчу» даецца па пяць хвілін.

«Ёсць стэрэатып, што да нас прыходзяць адны няўдачнікі, — падзялілася іншы арганізатар «хуткіх спатканняў» **Анастасія Маглашава.** — Але гэта не так. Напрыклад, асноўная маса ўдзельнікаў-мужчын — гэта людзі, якія ўвесь час працуюць. Таму ў нас шмат праграмістаў, урачоў. Ім проста не хапае часу на тое, каб пазнаёміцца з супрацьлеглым полам».

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

РазМЕРКАВАННЕ

КУЛЬТУРУ — У МАСЫ,

Кожны сам рэжысёр свайго лёсу

— А дзе тут Дом культуры? — пакуль ішла з чыгуначнай станцыі, «замучыла» гэтым пытаннем чалавек сем: у незнаёмым месцы цяжкавата арыентавацца, а ў Смалявічах давялося пабываць упершыню. Паводле легенды, даўным даўно тут рос непралазны лес, куды злая мачаха адвезла сваю падчарыцу. Бацька занепакоіўся, куды ж прапала дачка, і пайшоў на пошукі. Знайшоў ён яе пад шатамі смалістых соснаў. Там і заснавалі Смалявічы... А зусім нядаўна, у жніўні, сюды трапіла Ірына Гудойць. Не, не падумайце, ніякай «злой мачахі» і іншых трагічных абставін. Усяго толькі размеркаванне пасля заканчэння сталічнага ўніверсітэта культуры. Як жывецца маладому вядучаму метадысту па культурна-забаўляльнай дзейнасці?

Магчыма, адаптацыя была б больш складанай, калі б не пяць гадоў жыцця ў студэнцкім інтэрнаце. У Смалявічах настолькі вострых адчуванняў не было.

ПАСПРАБАВАЦЬ УСЁ

...Горад сустрэў пахмурным надвор'ем і восеньскай шэрасцю, а мая суразмоўца — фарбамі. Прычым у прамым сэнсе гэтага слова. Калі я прыйшла, Ірына якраз размалёўвала гуашшу літары на паперы.

— Рыхтую гульнявую праграму для дзяцей, вось і запасаюся рэквізітам, — патлумачыла мне сэнс сваёй працы. — З малымі мне найбольш цікава, але, па назіраннях, дзіцячыя гульнявыя праграмы вельмі часта падабаюцца і дарослым.

Працоўны дзень у дзяўчыны звычайна пачынаецца а восьмай раніцы і доўжыцца да пяці гадзін вечара. Але калі гаворка ідзе пра арганізацыю свят, лішнія адпрацаваныя гадзіны лічыць не выпадае. Ірына згадвае, што большасць яе сяброў і знаёмых жыве ў Мінску — праўда, паехаць туды на кожныя выхадныя не атрымліваецца. Як правіла, на суботу-нядзелю прыпадаюць тыя самыя святы, таму даводзіцца працаваць. Нядаўна, напрыклад, ездзілі ў Слуцк на абласное мерапрыемства. Вось і вышла, што ў бацькоў (яны жывуць недалёка ад Гомеля) дзяўчына са жніўня яшчэ ніводнага разу не была. Дабірацца, дарэчы, не так складана — чатыры гадзіны на цягніку. Мама ўжо нават «пагражала»: «Калі не прыедзеш, сама да цябе прыеду!».

Ірына кажа, што да такога графіка яна, у прынцыпе, прызвычаілася.

— Спачатку мяне крыху «накрыла», — прыгадвае суразмоўца. — Новыя абставіны як-ніяк. Мая суседка (дзяўчына пару гадоў таму гэтак жа прыехала па размеркаванні, дзеліць з Ірынай адзін інтэрнацкі блок на дваіх. — **Аўт.**), дзякуй ёй, падтрымлівала і супакойвала, нават дазволіла карыстацца сваёй пральнай машынай.

Магчыма, адаптацыя была б больш складанай, калі б не пяць гадоў жыцця ў студэнцкім інтэрнаце. Тады, як кажа сама Ірына, «хатняя дзяўчынка» прыехала ў Мінск і была ў шоку ад таго, што ўсё вакол невядомае, а побач у пакоі жывуць два зусім чужыя чалавекі. У Смалявічах настолькі вострых адчуванняў не было.

Цяпер сапраўды сумаваць няма калі, бо яшчэ і сябры часам клічуць дапамагчы арганізаваць ці правесці мерапрыемства. Рабіць гэта даводзіцца не толькі ў сталіцы. Нядаўна сяброўка, што паехала працаваць у Свіслач, на Гродзеншчыну, запрасіла да сябе. Разам дзяўчаты справіліся са «Свіслацкім кірмашом».

— Пакуль што вельмі хочацца паспрабаваць усё, чаму мяне навучылі. Ведаю, што такі запал вельмі хутка «перагарае», а таму гэтыя два гады вельмі важныя, — прызналася мая суразмоўца.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
10 10 2013 г.

КУЛЬТУРУ — У МАСЫ

ПРАФЕСІЙНАЯ «КУХНЯ»

Каб «несці культуру ў масы» аднаго жадання, вядома, недастаткова. Сёлета Ірына атрымала дыплом Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры. Вучыцца там — гэта зусім не «лафа» пры ўмове няспыннага ўдзелу ў творчым працэсе.

— Першым часам я не разумела, што ж гэта такое: у раскладзе напісана, што вучымся з 11.00 да 14.00, а насамрэч ва «ўніверы» даводзіцца сядзець з 9 раніцы да 9 вечара, — кажа Іра. — Пасля ўжо стала лягчэй, тым больш што з намі па такім жа раскладзе жылі і нашы педагогі (напрыклад, актрыса тэатра і кіно Алеся Пухавая, рэжысёр масавых свят Аляксей Камінскі).

І пра адпачынак у выхадныя заставалася толькі марыць.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

У гэтыя дні студэнтаў чакала практыка, якую знаходзілі выкладчыкі (дзе толькі не давялося паўдзельнічаць — ад свята горада да Дэльфійскіх гульняў!). Ніякіх грошай за гэта, зразумела, студэнтам не плацілі, затое можна было паназіраць за «кухняй» будучай прафесіі.

— Мая спецыяльнасць — «рэжысура свят», — расказвае дзяўчына. — Падчас размеркавання аказалася, што многія едуць працаваць у вясковыя клубы. Пры паступленні пра размеркаванне не думаеш увогуле. Але я лічу, што тое месца, якое дасталася мне, — гэта нармальны варыянт.

Пры узгадванні Смалявіч у выпускніка ВНУ сапраўды не павінны «падкошвацца» калені. Такая жаданая многімі сталіца зусім блізка, і штодзень шмат людзей едуць туды на працу на электрычках і маршрутках. Многія мінчане, дарэчы, таксама кожную раніцу гэтак жа дабіраюцца працаваць са сталіцы ў Смалявічы. Ірына тут пабывала яшчэ студэнткай, а таму крыху ведала, чаго чакаць ад горада.

ГАСЦІННЫ ПРЫЁМ І… БУЛЬБА

…Пасля атрымання дыплома і пераезду на месца працы хацелася як мага хутчэй наладзіць быт:

— Я жыву ў асобным пакоі, санвузел у нас з суседкай на дваіх адзін, а вось кухня ў інтэрнаце агульная на некалькі пакояў, — кажа Ірына. — Але я гатую на плітцы, якая ў мяне яшчэ са студэнцкіх часоў. Да таго ж нядаўна набыла электрапеч, таму з харчаваннем цяпер праблем няма.

Але, калі б цяжкасці з «правізіяй» і здарыліся, «галодная смерць» маладому спецыялісту ўсё роўна не пагражала. Як толькі Ірына прыехала ў Смалявічы, адразу ж стала ўладальніцай… бясплатнага мяшка бульбы. Гэта вадзіцель, які дапамагаў перавозіць дзяўчыне рэчы з Мінска, па сваім жаданні заехаў дадому і набраў «другога хлеба».

— Найбольш здзівіла тое, што мяне з самага прыезду не пакідалі адну, — кажа Ірына, якая прыехала ўладкоўвацца на працу з адной толькі дамскай сумачкай.

— А дзе ж вашы рэчы? — здзіўлена спыталі ў яе.

А рэчы былі ў Мінску, у камеры захоўвання на вакзале. Пяць скрыняў і дзве сумкі. У раённым аддзеле культуры далі машыну з вадзіцелем і дапамаглі ўсё прывезці. Адна з калег пусціла Іру пажыць да сябе:

— Пакой у інтэрнаце, які належыць мясцоваму аграрна-тэхнічнаму ліцэю, я атрымала праз два тыдні пасля прыезду, — кажа дзяўчына. — Дагэтуль, без усялякіх грошай, жыла ў сям'і цудоўнага чалавека, Ларысы Уладзіміраўны Бусько.

БЫЦЬ УВЕСЬ ЧАС У РУХУ!

Наш малады спецыяліст прыпыняе працу з рэквізітам, і мы ідзём прагуляцца па Смалявічах, у якіх Ірыне цягам як мінімум двух гадоў даводзіцца працаваць. Цікава, дзе і як тут адпачывае моладзь і колькі гэта каштуе? Ці таксама ў сталіцу ездзіць?

— О, пра гэта я пакуль ведаю мала, — усміхаецца Ірына. — Часам, бачу машыны на плошчы, у якіх адчынены дзверы і гучыць музыка. Людзі побач стаяць, нешта абмяркоўваюць — «тусуюцца». Зразумела, у Смалявічах ёсць дыскатэка, кавярня, але я пакуль, калі дазваляе час, еду адпачываць да сяброў у Мінск.

Многім здаецца, што, пакінуўшы мегаполіс, чалавек атрымлівае перш за ўсё больш спакойны рытм жыцця. Ірына ж лічыць па-іншаму:

— Хоць ад майго дома да працы 15 хвілін хадзьбы, я з такой думкай не пагаджуся. Каб не засяроджвацца на праблемах, трэба пастаянна быць у руху. Акрамя асноўных абавязкаў, якія маю цяпер, двойчы на тыдзень езджу ў сталіцу займацца ў харавой капэле. На рабоце гэта захапленне толькі падтрымліваюць. Таму ў маім выпадку рытм жыцця застаўся амаль такім жа, як у Мінску.

Для «свецкага праменаду» сярэдзіна буднага дня — не самы прыдатны час, таму з усіх «прынад» начнога жыцця Смалявіч удаецца больш-менш разгледзець толькі кінатэатр «Радзіма», які па сумяшчальніцтве — інтэрнэт-клуб і дыскатэка. У кіно на дзіцячы сеанс квіток каштуе 5 тысяч рублёў. За 25 тысяч можна пайсці на прэм'еру фільма.

«МІФЫ» НОВАГА ЖЫЦЦЯ

Мне прыгадаўся досыць распаўсюджаны «міф»: жыццё ў маленькіх гарадах больш таннае. На гэтую згадку Ірына толькі ўсміхаецца:

— Давайце зойдзем у крамы!

У цэнтры горада іх сапраўды шмат. Некаторыя крамкі працуюць дапазна, гадзін да 11 вечара. Да таго ж у Смалявічах ёсць і вядомы сеткавы гіпермаркет, на які, праўда, паглядзець не давялося: далекавата ад Дома культуры. Убачыўшы цэннікі на малако, каўбасу, крупы і іншыя прадукты, пераконваемся ў тым, што лічбы такія ж, як і ў сталіцы, — хіба што хлеб і кандытарскія вырабы мясцовай выпечкі больш танныя.

Ірына ў справе смалявіцкага шопінгу чалавек больш спрактыкаваны, чым я:

— Некаторая садавіна і гародніна нават даражэйшая, чым у Мінску. А яшчэ касметыка адрозніваецца па кошце. Вось такі лак для пазногцяў набывала нядаўна ў сталіцы на некалькі тысяч менш.

Пра заробак Ірына сціпла сказала: «Зарплата ў мяне невялікая — 1 мільён 700 тысяч рублёў, але два гады трэба неяк пратрымацца».

Дзяўчыне зараз вельмі хочацца набыць сёе-тое з тэхнікі ў дом: тэлевізар, напрыклад, а яшчэ нядрэнна было б інтэрнэт правесці. На новым месцы «без нічога» досыць цяжка…

Паразмаўлялі мы пра жыццё і планы на будучыню. Пра тое, ці жадае Ірына застацца ў Смалявічах пасля абавязковых двух гадоў адпрацоўкі, я не запыталася наўмысна. Надрукаваны на старонках газеты, яе адказ выглядаў бы як нейкае абяцанне… А падсумаваць вынікі ўсяго вышэйнапісанага дапамагла выпадковасць. Назад у Мінск давялося ехаць на маршрутцы. Праз некалькі кіламетраў пасля Смалявіч пабачыла шыльду на аўтобусным прыпынку. Там было напісана «Новае жыццё»…

Ганна ГАРУСТОВІЧ.
Фота аўтара.
Мінск — Смалявічы — Мінск.

Крок у будучыню

ЯК З БУХГАЛТАРА ЗРАБІЦЬ ПРАГРАМІСТА…

Прафесійную ІТ-адукацыю ў Беларусі цяпер можна атрымаць не толькі ў ВНУ ці на спецыялізаваных курсах. У кастрычніку пачынаецца навучанне ў беларускай камп'ютарнай акадэміі «ШАГ».

Акадэмія — гэта частка міжнароднай сеткі, якая з'явілася ва Украіне 14 гадоў таму. Сёлета адкрываюцца навучальныя лабараторыі ў Мінску, а ў наступным годзе плануецца абсталяваць іх і ў абласных гарадах.

Дырэктар беларускай камп'ютарнай акадэміі Аліна Даўгіх займалася падборам персаналу ў ІТ-кампаніях, таму вельмі добра ведае пра вялікі недахоп кадраў у сферы інфармацыйных тэхналогій. Між іншым, у Беларусі ІТ-сфера развіваецца вельмі імкліва. Гэта перспектыўная і высокааплатная галіна.

Навучанне ў акадэміі прадугледжана наступнае: 2,5 года — доўгатэрміновы курс і 1 год — кароткатэрміновы. Па словах Аліны, будучым студэнтам неабавязкова мець нават базавыя тэхнічныя веды: іх можна будзе атрымаць у акадэміі «з нуля». У праграме для пачаткоўцаў — паступовае ўвядзенне ў інфарматыку, алгарытмізацыю, логіку…

— Каб з бухгалтара зрабіць праграміста, трэба, каб ён спачатку перастаў быць бухгалтарам. Гэтым мы і будзем займацца — мяняць мысленне людзей, — раскрывае методыку навучання дырэктар установы.

Апроч курсаў для студэнтаў, акадэмія плануе праводзіць майстар-класы, у якіх змогуць удзельнічаць усе ахвотныя. А яшчэ на яе базе будзе праходзіць рэгіянальны этап міжнароднага конкурсу ІТ-праектаў «Залаты Байт», які стартуе ўжо ў кастрычніку.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.

Бюджэт у «кароткіх штоніках»

СТАЦЬ БАГАТЫМ… З МАЛЕНСТВА

Не будзе адкрыццём сцвярджэнне, што традыцыйнай «крыніцай» папаўнення бюджэту для дзяцей з'яўляюцца іх бацькі ці іншыя родныя. Ну, сапраўды, адкуль яшчэ ў малечы могуць узяцца сродкі? Яны ж зарплату не атрымліваюць. Але, як высвятляецца, падлеткі (нават малодшыя школьнікі) могуць самастойна зарабляць. Праўда, пры адной істотнай умове — наяўнасці пэўных ведаў пра грошы. Праграма па фінансавай граматнасці сярод дзяцей і падлеткаў «Афлатун» можа ў гэтым дапамагчы.

Навука ад «мільянераў» з трушчоб

Гэты праект нарадзіўся ў Індыі. Там шмат дзяцей, у якіх няма бацькоў і нават даху над галавой. Жыццё прымусіла іх навучыцца зарабляць самастойна: няхай і не вялікія, але свае грошы. Таму заснавальнікі праекта вырашылі падказаць такім дзецям, як можна развіваць уласны бізнес. А пасля праграма пачала прывабліваць усё большую аўдыторыю, і цяпер фінансавай граматнасці вучацца ў 101 краіне — не толькі дзеці-сіроты, хлопчыкі і дзяўчынкі з малазабяспечаных сем'яў, але і проста звычайныя падлеткі, паколькі ў многіх краінах курсы па фінансавай граматнасці пакуль што ў школах не выкладаюцца.

У Беларусі ў некалькіх навучальных установах такія спецыяльныя факультатывы і дадатковыя заняткі ўжо з'явіліся. Да таго ж у Нацыянальным інстытуце адукацыі на аснове матэрыялаў праекта «Афлатун» распрацавана адпаведная вучэбная праграма.

Першы крок — ён важны самы

Вынікі заняткаў на такіх курсах не прымушаюць сябе чакаць. Напрыклад, два хлопчыкі з Таджыкістана — Джамшад і Джавахір — пасля іх наведвання ацанілі патрэбы свайго раёна і адкрылі ўласны бізнес, пакуль што невялікі. Яны оптам закупілі карткі для папаўнення рахунку мабільнага тэлефона, бо ў іх населеным пункце не ўсе мелі магчымасць рабіць гэта рэгулярна і такім чынам не маглі карыстацца мабільнай сувяззю. Хлопчыкі пачалі прадаваць іх у розніцу ўсім ахвотным.

У беларускіх маленькіх «прадпрымальнікаў» ужо таксама ёсць свае дасягненні. У 2011 годзе смаргонскія школьнікі пры дапамозе мясцовага Кансультацыйнага цэнтра па ахове дзіцячых правоў вырашылі рэалізаваць праект па рамонце старой мэблі. Падчас летніх канікул вучні 4-х класаў (17 дзяўчынак і 8 хлопчыкаў) пры падтрымцы адукацыйных устаноў і цэнтраў занятасці адрамантавалі 35 сталоў і 210 крэслаў. 30 працэнтаў свайго даходу яны аддалі мясцоваму дзіцячаму дому, а астатнія — уклалі ў гэты ж праект. Вось і атрымліваецца, што нават у 10 гадоў можна працаваць у сапраўднай бізнес-камандзе.

Каб мара стала рэальнасцю!

Пакуль што «Афлатун» рэалізуецца ў трох беларускіх гарадах: у Гродне (у школе для дзяцей з парушэннямі слыху), Смаргоні і Кобрыне.

Кобрынскія навучэнцы і прыехалі на «круглы стол» па развіцці праграм фінансавай граматнасці сярод дзяцей і падлеткаў, арганізаваны прадстаўніцтвам Міжнароднага дзіцячага фонду пры падтрымцы сакратарыята «Афлатун», каб не толькі расказаць, чаму навучыліся, але і прадэманстраваць. Дзяўчынкі і хлопчыкі займаюцца ў сацыяльным інтэрактыўным тэатры «Позірк», таму паказалі ўдзельнікам спектакль «Мара застаецца марай», пастаўлены па ўласным сцэнарыі.

…Падлетак вельмі хацеў быць гітарыстам у музычнай групе. І вось, здаецца, яго мара пачынае збывацца — ён атрымаў запрашэнне. Але ёсць умова — наяўнасць электрагітары. Грошай на яе ў хлопчыка няма, а бацькі дапамагчы адмовіліся. Фінал у гісторыі сумны: хлопец так і не змог набыць музычны інструмент.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Тэатр кобрынскіх школьнікаў невыпадкова называецца інтэрактыўным — гледачы таксама могуць прыняць непасрэдны ўдзел і нават змяніць сюжэт спектакля. Вось і ўдзельнікі «круглага стала» вырашылі перайграць дзею, дзе, на іх думку, бацькі няправільна аднеслі да сынавай просьбы. Яны параілі хлопцу знайсці сабе працу і нават падказалі яму некалькі варыянтаў.

Кіруй сваімі фінансамі сам!

Начальнік аддзела Нацыянальнага банка Юлія Саковіч лічыць, што ў апошнія гады праблема павышэння фінансавай граматнасці становіцца ўсё больш актуальнай. Галоўны банк краіны і міжнародны Альянс за фінансавую даступнасць правялі анкетаванне, у тым ліку і сярод нашых землякоў. Рэспандэнтам трэба было разлічыць працэнты па ўласным дэпазіце, назваць узровень інфляцыі ў 2011 годзе і ведаць прыблізную стаўку па банкаўскіх дэпазітах. Толькі 5 працэнтаў з усіх апытаных правільна адказалі на пастаўленыя пытанні…

Зараз ствараецца цэлая сістэма, якая прадугледжвае навучанне фінансавай граматнасці праз сродкі масавай інфармацыі. Па ініцыятыве Нацыянальнага банка з'явіўся мультфільм «Азбука грошай, або Як дапамагчы дзіцяці вырасці багатым».

На Захадзе неабходнасць ведаў пра тое, як зарабіць грошы і як правільна разлічыць свае выдаткі, даўно ўжо стала зразумелай і насельніцтву, і ўрадам. У Германіі, напрыклад, кожнае дзіця з малых гадоў мае банкаўскі рахунак, які папаўняе ўласнымі намаганнямі. Важна, каб дзеці зразумелі, што грошы бацькі атрымліваюць не проста так, а за выкананую працу.

Надзея ЮШКЕВІЧ.

Вулічны «фітнэс»

УБАЧЫЎ ТУРНІК? ПАДЦЯГНІСЯ!

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

У Мінску адкрылася першая ў Беларусі варкаўт-пляцоўка. Яна знаходзіцца на стадыёне Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, але займацца тут могуць усе ахвотныя. Street Workout («вулічныя трэніроўкі») — новая разнавіднасць фізічнай культуры, якая ўключае ў сябе выкананне розных практыкаванняў на звычайных турніках, гарызантальных лесвіцах, «шведскай сценцы», брусах... Да нас гэты накірунак прыйшоў не так даўно, але адкрыццё спецыяльнай пляцоўкі сведчыць пра рост яго папулярнасці.

Гэта не шоу, але...

«Гэта не шоу, але пераўзыходзіць усе фантазіі», — радкі з песні пра вулічную культуру, з якой выступілі на адкрыцці варкаўт-пляцоўкі віцебскія хлопцы-спевакі Прарок і Дарвін. Сапраўды, вулічныя гімнасты здзівілі публіку сваімі магчымасцямі. Напрыклад, трымаючыся толькі рукамі (або рукой!) за «шведскую сценку», «завісалі» над зямлёй пад тупым вуглом, рабілі «сонейкі» на турніках, адціскаліся, трымаючыся нават не за металічную апору, а за рукі сваіх жа таварышаў... Мне здавалася, што такое можа быць толькі ў цырку!

Магчыма, праз некаторы час варкаўт стане алімпійскім відам спорту. Пакуль жа асноўная яго мэта — барацьба з алкагалізмам, наркаманіяй і гульнявой залежнасцю сярод моладзі. Нягледзячы на тое, што гэтая разнавіднасць вулічнай культуры яшчэ не вылучаецца ў асобны від спорту, ужо зараз на прасторах СНД праводзяцца чэмпіянаты па варкаўце. Прыхільнікі руху могуць пазмагацца ў такіх дысцыплінах, як падцягванне на адной руцэ, адціскванне ўверх нагамі, адціскванне з дадатковай вагой у 48 кілаграмаў...

Замест алкаголю і камп'ютара

Максім Сундукоў, кіраўнік суполкі «Workout Community Belarus», лічыць, што зараз гэты кірунак фізічнай культуры вельмі актуальны:

— Паўсюдна мы сутыкаемся з алкагалізмам, у тым ліку і дзіцячым, падлеткавым. Другі варыянт, калі дзеці марнуюць час на анлайн-гульні, таксама не дадае аптымізму. У той жа час вулічныя трэніроўкі ў стане сапраўды зацікавіць моладзь.

Па словах Максіма, варкаўтам можна пачаць займацца практычна з любога ўзросту, нават калі ў цябе амаль нулявая фізічная падрыхтоўка. Праз год штодзённых трэніровак вынікі не прымусяць сябе чакаць.

Нягледзячы на тое, што гэты кірунак вулічнай культуры ў Беларусі пакуль мала вядомы шырокай публіцы, ужо зараз з ім знаёмы каля 15 тысяч маладых беларусаў.

Фітнэс-клубы «адпачываюць»

16-гадовы Пётр Гамолка пачаў займацца на турніках года паўтара таму. Вырашыў трэніравацца, каб развіваць магчымасці свайго цела. Чым жа адрозніваюцца падобныя заняткі ў фітнэс-клубах ад трэніровак на вуліцы?

— Па-першае, workout — гэта бясплатна. Навошта плаціць грошы за абанемент у фітнэс-клуб, калі можна зрабіць тое ж самае на вуліцы? Проста ідзеш па вуліцы, бачыш турнічок — і «качаешся». Па-другое, звычайна мы займаемся ў кампаніі і такім чынам маем магчымасць пераймаць новыя элементы.

З іншага боку, такія заняткі патрабуюць проста каласальных як фізічных, так і псіхалагічных намаганняў. Пятро паказаў свае рукі — сцёртыя амаль да крыві, з мазалямі. Некаторыя хлопцы носяць спецыяльныя скураныя пальчаткі, але яны праз некаторы час рвуцца: трэніроўкі, як правіла, вельмі напружаныя.

Новая пляцоўка падыходзіць не толькі непасрэдна для прадстаўнікоў варкаўт-культуры. Фрыстайл-баскетбалісты, брэйкдансеры таксама змогуць на ёй займацца. Можна спадзявацца, што хутка стадыён БНТУ стане цэнтрам вулічнай культуры.

Надзея ЮШКЕВІЧ.

Размаўляем па-беларуску

ПАЧНІ З СЯБЕ

Зміцер Шалкоў — выпускнік адной са сталічных гімназій, зараз вучыцца на першым курсе БНТУ. Адразу і не скажаш, што гэтаму росламу, прывабнаму юнаку ўсяго 18 гадоў. Пры сустрэчы хлопец прыгадвае, як у гімназіі дзяўчаты не ўпускалі магчымасці паўсміхацца яму на перапынках у школьнай сталоўцы. Іх не бянтэжыла тое, што Зміцер заўсёды размаўляе па-беларуску.

Вясной мінулага года хлопец разам з сябрамі паехаў па квіткі на канцэрт. У той дзень яны вырашылі гаварыць толькі па-беларуску. Былі на веласіпедах. Зміцер прабіў кола і ўсе дабіраліся дамоў да Малінаўкі пешшу, таму размаўлялі многа і доўга. І так атрымалася, што гэтая міжвольная забава змяніла кожнага з іх.

— Шчыра кажучы, той выпадак перавярнуў мой светапогляд, — дзеліцца хлопец. — Не магу адказаць, горшым ці лепшым я зрабіўся, але ўспрымаць і разумець гэты свет стаў інакш.

Вядома, спачатку не хапала слоўнікавага запасу, але дапамагло тое, што ў сваёй кампаніі сябры размаўлялі паміж сабой толькі на роднай мове. З таго моманту, як перайшоў на родную мову, Зміцер чытае амаль усё, што напісана па-беларуску, і гэта вельмі дапамагае.

Разам з тым, з'явілася цікавасць да беларускай культуры. Зміцер стаў хадзіць на канцэрты беларускамоўных выканаўцаў, на выставы айчынных мастакоў...

— Мне надта падабаюцца людзі, якія там «тусуюцца». На беларускамоўных флэйвах (аўтарскіх сустрэчах) заўсёды прысутнічае асаблівая, шчырая і цёплая атмасфера... Гэта так крута! Што датычыць майго асабістага асяроддзя, там амаль нічога не змянілася. Вядома, некаторыя знаёмыя заявілі, што я размаўляю «па-калгаснаму», але большасць падзяліла маё захапленне. А сям'я па-сапраўднаму падтрымала! Напрыклад, маці майго сябра ставіцца да яго захаплення беларуская мовай абыякава, а бацька наогул супраць. Але сябар працягвае размаўляць па-беларуску. І гледзячы на яго, я разумею, што галоўнае — не здраджваць самому сабе.

Калі незнаёмыя людзі пытаюцца, як куды-небудзь дайсці або даехаць, я заўсёды тлумачу па-беларуску. Пытаюцца па-руску, а дзякуюць ужо на роднай мове. Для мяне гэта нашмат прыемней, чым «спасибо». Аднойчы жанчына нават пачала ўдакладняць дарогу таксама па-беларуску.

Бывае, што беларуская мова прыносіць хлопцу нават матэрыяльныя выгоды! Так, улетку Зміцеру зрабілі зніжку ў 30 долараў, калі ён звярнуўся па мабільны тэлефон у адну з анлайн-крам Мінска.

А вось у школе прыходзілася размаўляць па-руску, бо гімназія, якую сябры скончылі ў гэтым годзе, рускамоўная, і большая частка настаўнікаў не размаўляе па-беларуску. З рэпетытарамі па фізіцы і матэматыцы зносіліся таксама па-руску. У астатніх выпадках Зміцер выкарыстоўвае родную мову.

— Настаўнікі і аднакласнікі размаўлялі са мной з павагай, я адчуваў падтрымку. Выкладчыца па гісторыі распавядала, што сама вучылася ў беларускамоўнай школе, але не чакала, што менавіта я выберу родную мову ў паўсядзённым жыцці, — дзеліцца Зміцер.

Гэтай жа кампаніяй хлопцы летам адпачывалі ў Балгарыі. І там не здрадзілі сваім прынцыпам і мове.

— Калі я размаўляю па-беларуску на вуліцах сталіцы ці ў грамадскім транспарце, людзі здзіўляюцца. А за мяжой усё прасцей: ім, наадварот, цікава пачуць новую гаворку.

Немагчыма штосьці змяніць, калі будзеш саромецца сам сябе, сваёй мовы і культуры, лічыць Зміцер і заўважае, як усё больш людзей звяртаецца да беларускай мовы ў паўсядзённасці. Ён лічыць, што немагчыма прывіць патрыятызм і павагу да мовы гвалтам. Чалавеку патрэбен прыклад: у сям'і, у сваім асяроддзі, або з гісторыі сваёй Радзімы...

Вераніка ЦВІРКО.

Медыяпалігон

Жыццё горада вачыма маладых

Лекцыі ад вядомых публіцыстаў, майстар-класы журналістаў і фатографаў з Расіі і Беларусі, аператыўная анлайн-трансляцыя жыцця сталіцы ў інтэрнэце — Мінск на наступным тыдні стане палігонам не толькі для маладых журналістаў з Беларусі, але і іншых краін СНД.

— Удзельнічаць у «Медыяпалігоне-24» будзе моладзь з Масквы, Санкт-Пецярбурга, Калінінграда, Мінска, Брэста... Усяго каля 200 журналістаў, — паведаміў карэспандэнту «Чырвонкі» прадстаўнік аргкамітэта праекта Аляксей Суднікаў. — Пераважную большасць удзельнікаў складуць менавіта расіяне.

Як кажа Аляксей, для зацікаўленых пройдзе шэраг майстар-класаў, трэнінгаў, лекцый ад беларускіх і расійскіх журналістаў, выкладчыкаў Інстытута журналістыкі БДУ, які разам з часопісам «Рускі рэпарцёр» выступіў арганізатарам медыяпраекта.

Апагеем семінара стане спецыяльны праект «Мінск-24». 18 кастрычніка на працягу ўсяго дня журналісты будуць працаваць у горадзе разам з настаўнікамі школ, супрацоўнікамі заапарка, грамадскіх арганізацый, мінскіх тэатраў, з рабочымі заводаў і аператыўна асвятляць жыццё беларускай сталіцы ў выглядзе тэкставых паведамленняў і фотаздымкаў на сайце 24.rusrep.ru.

— Мэта гэтага праекта — паказаць жыццё горада за адзін дзень, — працягвае Аляксей Суднікаў. — Лепшыя матэрыялы пасля надрукуюць у часопісе «Рускі рэпарцёр».

Дагэтуль падобныя акцыі для маладых журналістаў ужо праходзілі ў Новасібірску, Екацярынбургу, Уфе і Казані.

Тарас ШЧЫРЫ.

У аб'ектыве

ЛЕТА КРАСНАЕ, БУДЗЬ СА МНОЙ...

Вось і прайшло лета... Гэтыя тры месяцы такога доўгачаканага адпачынку праляцелі, як заўсёды, нібы адно імгненне. Не тое, што навучальны год... Зноў прыйшоў час хадзіць у школу, рыхтаваць хатнія заданні. А так хочацца цэлымі днямі гуляць з сябрамі, спаць да абеду і рабіць усё, што хочам! Хутка ўжо не будзе і такіх цёплых дзён, ім на змену прыйдуць дажджлівыя будні восені. І пра лета 2013 года мне будуць нагадваць толькі шматлікія фатаграфіі.

Усе гэтыя тры месяцы я не расставалася з фотаапаратам. Я люблю здымаць прыроду, а лета — самы спрыяльны для гэтага час. Прыгадаем?..

Арына КАГАЛЁНАК, вучаніца 10 класа наваполацкай гімназіі № 2. Фота аўтара.

Фестываль

ПЕСНІ НАШАГА ДЗЯЦІНСТВА

У краіне стартаваў другі Міжнародны фестываль песень нашага дзяцінства «Крылатыя арэлі». Сёлета ён прысвечаны тэме спорту і фізічнай культуры, што набывае яшчэ большую актуальнасць для Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі напярэдадні XXII Алімпійскіх і XI Паралімпійскіх зімовых гульняў у Сочы і чэмпіянату свету па хакеі ў Мінску. У Беларусі фестываль праводзіцца разам з прадстаўніцтвам Рассупрацоўніцтва — Расійскім цэнтрам навукі і культуры ў Мінску пры актыўнай падтрымцы айчынных дзяржаўных і грамадскіх структур.

Прэзідэнтам фестывалю з'яўляецца Юрый Энцін, вядомы ў Расіі і за мяжой паэт, сцэнарыст, драматург, аўтар больш як 70 паэтычных зборнікаў. На яго вершы напісаны больш за 600 песень, многія з якіх гучаць у 50 мультфільмах і 100 кінафільмах, у тым ліку «Прыгожае далёка», «Антошка», «Чунга-Чанга», «Крылатыя арэлі».

Праграма фестывалю прадугледжвае правядзенне конкурсу дзіцячай песні «Крылатыя арэлі» і двух гала-канцэртаў, якія будуць арганізаваны ў Мінску ў дні правядзення Алімпіяды ў Сочы і чэмпіянату свету па хакеі ў Мінску.

Фестываль праводзіцца ў некалькі этапаў: прыём конкурсных матэрыялаў — да 6 снежня; завочны адбор па прадастаўленых удзельнікамі матэрыялах — з 9 па 22 снежня; праслухоўванне ў Расійскім цэнтры навукі і культуры ў Мінску (выніковы адбор) — 17-18, 24-25 ці 31 студзеня (у адзін з выбраных удзельнікамі дзён); гала-канцэрт, прысвечаны зімовай Алімпіядзе ў Сочы, — 14 лютага; гала-канцэрт, прысвечаны чэмпіянату свету па хакеі ў Мінску, — 16 мая.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Намінацыі конкурсу: сольнае выкананне, выкананне ансамблем, харавое выкананне, сямейны ансамбль. Жанр — вакал. Узрост канкурсантаў не абмяжоўваецца.

Конкурсныя матэрыялы (заявачны ліст), фатаграфіі ў сцэнічным касцюме, кароткая творчая характарыстыка (у вольнай форме), DVD ці CD-дыскі з відэа- ці аўдыязапісамі тых твораў, якія заяўлены на конкурс, удзельнікі накіроўваюць па пошце звычайным пісьмом (220004, г. Мінск, вул. Ракаўская, 16-Б, Расійскі цэнтр навукі і культуры) ці па электроннай пошце (rcnkminsk@mail.ru) з абавязковай пазнакай «Крылатыя арэлі».

Рэпертуар павінен складацца з дзвюх песень: першая — на вершы прэзідэнта фестывалю Юрыя Энціна, другая — песня пра спорт ці фізкультуру на рускай або беларускай мовах. Працягласць аднаго твора не павінна перавышаць чатырох хвілін. Кожны накіраваны ў аргкамітэт запіс павінен суправаджацца ўказаннем назвы твора, аўтара музыкі, аўтара тэксту, назвы ансамбля ці прозвішча выканаўцы, а таксама працягласці гучання твора.

Канкурсанты, якія пройдуць завочны адборачны тур, атрымаюць афіцыйнае пісьмовае запрашэнне ад аргкамітэта фестывалю для ўдзелу ў выніковым адборы. Па выніках апошняга тура пераможцам у розных намінацыях прысуджаецца званне: «Уладальнік Гран-пры», «1-е», «2-е», «3-е» месцы, а таксама прадастаўляецца права ўдзельнічаць у гала-канцэртах. Удзел у фестывалі бясплатны.

Па дадатковую інфармацыю адносна праекта можна звяртацца да начальніка аддзела Расійскага цэнтра навукі і культуры ў Мінску Кавалёвай Святланы Мікалаеўны (тэл./факс: 328 49 58, e-mail: rcnkminsk@mail.ru).

Сяргей СТАРЫНАЎ.

Аўтограф адмэтра

Артур БЕРКУТ:

«КАЛІ НЯМА «ШТУРШКА», НЕ БУДЗЕ І РЫЎКА»

Яго ведаюць многія. І не дзіўна: масціты рок-музыкант засвяціўся ў вялікай колькасці знакамітых і не вельмі камандаў, хоць і вядомы больш за ўсё як вакаліст гуртоў «Аўтограф» і «Арыя». Акрамя сваёй творчасці, Артур Беркут адметны тым, што супрацоўнічае з многімі маладымі рок-камандамі, запісваючы з імі песні і дапамагаючы «раскручвацца». У яго «спісе» значыцца больш за 70 калектываў. Аб магчымасцях, прыярытэтах прасоўвання рок-гуртоў, а таксама аб тым, якая музыка вартая права на існаванне, Артур і распавёў «ЧЗ».

— Існуе так званы «заходні шлях прасоўвання» рок-каманд з дапамогай прадзюсараў, гуказапісных кампаній і г.д. А ёсць наша «методыка» — прасоўвацца пры дапамозе вялікай колькасці канцэртаў самых розных маштабаў, паколькі прадзюсарская практыка ў нас развіта слаба, нават можна сказаць, што зусім не развітая. Як, па-вашаму, лепш развівацца?

— Перш за ўсё варта сказаць, што на заваёўванне музычнага алімпу моладзь глядзіць праз «ружовыя акуляры». Сітуацый накшталт «выступае ў клубе гурт, прыйшоў туды прадзюсар і пасля канцэрта адразу забраў яго з сабой» — поўная лухта, такога практычна ніколі не бывае! Я пражыў у Амерыцы 9 гадоў пасля падпісання кантракта з адной з буйных гуказапісных кампаній, і наш прадзюсар сказаў, што ніколі іх прадстаўнікі не ходзяць у клубы, каб паслухаць музыкантаў і адабраць сярод іх будучых «зорак». Гэта ўсё адбываецца звычайна па іншых схемах, часам для нас зусім незразумелых. Хтосьці кліча менеджараў з «лэйблаў» аціць творчасць, хтосьці распаўсюджвае дыскі са сваімі дэма-запісамі, у кагосьці ёсць знаёмы ў якой-небудзь з гэтых самых кампаній. Часцей за ўсё там і ўвогуле ўсё даўно праплачана. Не, бываюць, вядома, моманты, калі прадстаўнік «лэйбла» можа прыйсці выпадкова ў клуб і пачуць цікавую для сябе каманду, але гэта вялікая рэдкасць. У нас вялікая колькасць таленавітых музыкантаў, якіх наўрад ці хто-небудзь калі-небудзь пачуе. І калі не будзе ніякага «штуршка» з боку саміх музыкантаў — ніякага рыўка на «паверхню» не адбудзецца. Сёння вялізныя магчымасці для прасоўвання існуюць у першую чаргу ў інтэрнэце. На мой погляд, чым больш людзей бачаць групу, чым больш заўважаюць іх на разнастайных канцэртах, тым больш шанцаў прабіцца. Гэтаму спрыяюць таксама «сарафаннае радыё» і інтэрнэт. Ды і наогул, мне здаецца, што калі музыка добрая, калі заслугоўвае ўвагі, яна не застанецца незаўважанай.

— Ці варта звяртаць увагу толькі на песні на рускай мове або трэба выпускаць і англамоўныя рэлізы? Ці не з'яўляюцца англамоўныя кампазіцыі своеасаблівай «здрадай» роднай моўнай культуры?

— Кавер-версіі вядомых песень яшчэ ніхто не адмяняў. А ўласную творчасць, на маю, падмацаваную вопытам думку, у краіне, дзе амаль усе гавораць па-руску, лепш, вядома, выконваць на рускай мове. Дзякуючы гэтаму пашыраецца аўдыторыя, становіцца больш зразумела, пра што песні. Тым больш, калі тэкст закранае тэмы, блізкія ўсім.

— Якой павінна быць музыка калектыву, каб вы захацелі выканаць сумесна з імі якую-небудзь іх кампазіцыю?

— Музыка бывае розная, прадстаўленая самымі разнастайнымі жанрамі і кірункамі. І сказаць адназначна, якая для мяне дрэнная, а якая добрая, я не магу. Тым не менш, не прымаю музыку занадта злую і агрэсіўную па сваёй сутнасці (колькі б ні гаварылі, што рок — гэта музыка агрэсіі, я з гэтым не згодны), а таксама залішне «нашпігаваную» палітыкай ці ідэалогіяй. Я лічу, што кесару — кесарава, а рокеру — рок-н-рольнае.

Ілья КАТУСАЎ, фота аўтара.

Muz=загруз

МЫ ПАЧЫНАЕМ НАША ШОУ

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Punk-rock show, Metal-show, Rock'n'roll-show... Дзіўныя назвы, убачыўшы якія, звычайны чалавек атрымлівае «лінгвістычны параліч» і няўпэўненасць у эстэтычным успрыманні свету... Шчыра кажучы, у андэграўндзе спрэс энтузіязм ды самадзейнасць. Музыкі, пісакі розных масцяў, фатографы, мастакі... Усіх і не запомніш. Але сярод гэтых дзеячаў ёсць адзін від, вельмі цікавы і, не варта баяцца гэтага слова, самабытны — арганізатар канцэртаў.

Попыт нараджае прапанову? Выдатна! І з'яўляецца такі арганізатар. Пакуль што ён чалавек звычайны, але з намерамі перавярнуць свет. Для сябе, пад сябе — адзінаму рок-н-рольнаму богу вядома, што адбываецца ў галаве гэтага небаракі. Музычных гуртоў дастаткова, рэпетыцыйныя пункты трашчаць ад людзей, якія хочуць выйсці на сцэну. Месцы для выступлення тых, хто толькі пачаў іграць, і тых, хто іграе даўно, але не ўмее, таксама ёсць. І тут з'яўляецца на гарызонце той самы, які хоча пад сябе свет... ну, вы памятаеце.

І вось надыходзіць час: The show must go on! Абавязкова шоу. Арганізатары такога кшталту проста не бачаць, як можна назваць сваё «дзіця» інакш. Гэтыя дзівоснага розуму людзі здольныя стварыць сапраўды нешта грандыёзнае! Мяркуючы па афішах, гэта заўсёды менавіта так. Гэта нават больш грандыёзна, чым канцэрты Rammstein і Depeche Mode, разам узятыя. Мне проста страшна падумаць, што магло б здарыцца з Мілен Фармен, калі б яна трапіла на такое шоу падчас візіту, які мае адбыцца...

Але вернемся да нашых геніяў арганізатарскага мастацтва. Стандартная — бо «геніі» думаюць аднолькава — афіша абяцае нешта незразумелае. Гурты на такіх канцэртах, як правіла, малавядомыя. Музыкі самі мітусяцца, прадаючы квіткі на свой канцэрт сябрам ды знаёмым. Такая ўмова ўдзелу ў канцэрце. Бо не панская гэта справа — даваць рэкламу, прывабліваць гледачоў, прадаваць квіткі. Займацца арганізатарскай дзейнасцю ў абавязак нашага «арганізатара» не ўваходзіць. Яго справа — правяраць і прадаваць квіткі на ўваходзе, гандлюючы тварам (а сяброўку ці некалькі можна і так прапусціць). Але тут нічога не скажаш: хто як можа...

І ўсё ж хопіць хадзіць кругом ды навакол. The show must go on! І яно пачалося!

Праўда, потым, пасля фінальных нот апошняга гурта, застаецца шмат пытанняў. Раней, па нявопытнасці, у мяне яшчэ прысутнічала вострае пачуццё няспраўджаных надзей. Як і надзей на тое, што вось сёння ўсё ж такі будзе шоу, шоу, якое можна выціснуць з тых нешматлікіх набыткаў, якімі валодае андэграўндны люд. Верылася, што на гэты раз усё будзе па-іншаму: і гук на канцэрце дазволіць пачуць музыку гурта, а не хвіліны шуму, якія азначаюць песні; і ў час, паміж выступленнямі гуртоў не будзе збіта-пахабных конкурсаў; і, магчыма, будзе праца са святлом... А пасля гэтыя надзеі развеяліся і на першы план выйшла выразнае ўсведамленне таго, што адбываецца пад маскай show.

Не для людскіх сэрцаў робяцца такія канцэрты, а дзеля эга свайго. Напэўна... Колькі людзей, столькі і галоў, хіба ў кожную залезеш, высвятляючы матывы?

Вядома, не ўсё так дрэнна, і калі здзьмуць шалупінне, заўсёды адшукаецца чалавек або група аднадумцаў, якія імкнуцца знайсці і паказаць, падзяліцца з людзьмі добрымі групамі, выканаўцамі, песні якіх абавязкова знойдуць водгук у сэрцах.

Ведаю: у адказ у аўтара гэтых радкоў могуць паляцець камяні. Абвінавачванні ў клішэ або ў зайздрасці. Толькі няма яе. Ёсць горыч і стомленасць. Цяжка знайсці нешта сапраўды вартае сярод усяго, што запоўніла эфір навакольнага свету, свету андэграўнду. І цяпер сярод шматлікіх канцэртаў адшукаць нешта насамрэч жывое амаль немагчыма.

Андрэй КЛЯНОЎСКІ.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
10 10 2013 г.

Іголкай па скуры

ПРА СЯБЕ — МОВАЙ ТАТУ

1
Сямейны абярэг Алеся і Алесі Таболічаў.

Традыцыя нанясення малюнкаў на скуру ўзнікла яшчэ ў першабытныя часы. У старажытнасці выявы на целе чалавека служылі інфармацыяй пра яго род, становішча ў грамадстве, перамогі над ворагамі і надзяляліся магічнай сілай. А што сёння кіруе людзьмі, якія ўпрыгожваюць сябе рознымі мудрагелістымі ўзорамі?

Для каго і для чаго?

Алесь ТАБОЛІЧ, лідар гурта ZNICH і майстар татуіроўкі, мяркуе, што татуаж — ужо не адзінкавая з'ява, а масавая культура. Для чаго людзі робяць сабе татуіроўкі? Галоўная роля тут належыць самавызначэнню, перакананы майстар. Дарэчы, 80 працэнтаў ахвотных нанесці сабе выяву — жанчыны, якія такім чынам імкнуцца падкрэсліць сваю непаўторнасць. Мужчыны — у меншасці. Затое прадстаўнікі моцнага полу наносяць на цела маштабныя малюнкі, а жанчыны, наадварот, любяць невялікія.

— Я з гонарам магу сказаць, што ўвёў ва ўжытак арнаментальнае беларускае тату, — распавядае Алесь Таболіч. — Разам са сваёй будучай жонкай Алесяй мы захацелі, каб у кожнага з нас быў агульны сямейны абярэг, заснаваны на беларускіх традыцыях. І мы зрабілі на левай руцэ аднолькавыя татуіроўкі — засеянае поле, якое сімвалізуе працяг роду **(фота 1).**

Па словах майстра, цікавасць да беларускага арнаментальнага тату расце. У той жа час распаўсюджанне апошняга ён не лічыць модай.

— Гэта можна лічыць модным толькі ў коле людзей, якія маюць прыналежнасць да захавання нацыянальных каштоўнасцяў. А густы тых, каму больш даспадобы масавая культура, з цягам часу не мяняюцца. Яны робяць тое, што і рабілі: матылькоў ды коцікаў.

Ці сумяшчальныя Мікі Маус і бізнес?

Сённяшнія тэхналогіі дазваляюць пазбаўляцца ад татуіроўкі пры дапамозе лазера. Толькі, па словах Алеся, на гэта спатрэбіцца патраціць год, а часам і два. Каб не давялося пасля выводзіць малюнак, перад яго нанясеннем майстар размаўляе з кліентам, высвятляючы, наколькі той упэўнены ў сваім рашэнні. Калі ёсць нейкія сумненні, рабіць тату не варта.

— Колькі гадоў таму прыйшоў да мяне мужчына прадстаўнічага выгляду з непаўналетнім сынам, — распавядае Алесь. — Бацька напісаў заяву, што дазваляе нанесці сыну малюнак, які той хоча. Хлопец хацеў зрабіць на руцэ Мікі Мауса. А я падумаў, што сын вырасце і, хутчэй за ўсё, пяройме бацькоўскі бізнес, і гэты Мікі Маус будзе выглядаць як здзек. У выніку яны выбралі іншы малюнак. Праз некаторы час у кавярні да мяне падышоў салідны малады чалавек (як пасля высветлілася, той самы колішні хлопец) і падзякаваў за тое, што ў свой час я адгаварыў яго ад Мікі Мауса.

Алесь Таболіч упэўнены, што татуіроўка ці той жа перманент змяняе чалавека. Але, на думку майстра, мяжу, калі татуаж перастае быць упрыгажэннем і пераходзіць у безгустоўе, кожны вызначае для сябе сам.

Своеасаблівая «карта жыцця»

Спявачка Руся (фота 2), даследчыца беларускіх архаічных спеваў, можа пахваліцца выявамі традыцыйнага беларускага арнаменту на целе. Для яе працэс татуіравання — ад ідэі да апошняга штрыха татуіровачнай машынкі Алеся Таболіча на скуры — пераўтварыўся ў цэлую філасофію.

— Мне падаецца, што ў жыцці кожнага чалавека бываюць такія думкі: «Хачу сабе нешта намаляваць!». І ў мяне таксама ўзнікалі падобныя ідэі яшчэ ў падлеткавым узросце, — прызнаецца Руся. — Але я ніколі не спяшалася, таму што гэтае рашэнне павінна выспець. Калі ў маім жыцці пачаўся этап даследавання архаічнай спеўнай культуры, мне захацелася зрабіць сабе пэўную «метку». Таму можна лічыць, што мае малюнкі — своеасаблівая «карта жыцця».

Калі паўстала пытанне, якую выяву нанесці на цела, дзяўчына вагалася паміж рознымі варыянтамі.

— Але мне падалося, што гэта няправільна — рабіць сабе японскі іерогліф ці нейкага тыгра, бо якое дачыненне гэта мае да маіх культурных кодаў? Іншая справа — архаічныя сімвалы, якія выкарыстоўваюцца, у прыватнасці, у ткацтве.

Выбрала Руся тры выявы.

— Першы знак — гэта сувязь з продкамі, ён дапамагае мне прыйсці ў сусветнае мультыкультурнае грамадства з нечым сваім. Другі — веснавое абуджэнне зямлі і знак сонца. Я лічу, што ўсім беларусам не хапае сонечнай энергіі, і вось гэты сімвал мяне падтрымлівае.Трэці сімвал азначае павагу да сужэнца і моцную сям'ю. Я моцна і рамантычна закаханая ў свайго мужа, і калі сумую падчас гастроляў, то гляджу на руку і думаю, што ён мяне чакае дома **(фота 2)**.

2
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Не падхапіць «сінюю хваробу»

Безумоўна, незвычайныя ўзоры на Русінай руцэ выклікаюць увагу, а часам адбываюцца і цікавыя гісторыі, звязаныя з імі.

— Падчас аднаго з канцэртаў у Швейцарыі падышоў мужчына і запытаўся, што гэта за знакі ў мяне. І распавёў пра тое, што, напрыклад, калі чалавек не можа свабодна выказваць сваю грамадзянскую пазіцыю, ён прыбягае да «палітызаванай цялеснасці». І сапраўды, на скуры можна зрабіць любы мэсэдж. Мужчына аказаўся прафесарам Цюрыхскага ўніверсітэта. Ён сфатаграфаваў маю руку і цяпер выкарыстоўвае здымкі для сваіх лекцый.

Мяне папярэджвалі пра так званую «сінюю хваробу»: калі робіш адзін малюнак, пачынаеш уваходзіць у раж і хочацца яшчэ і яшчэ.

Невядома, што імкнуцца выказаць некаторыя людзі, але, калі меркаваць па іх «размаляванасці», «сказаць» ім ёсць пра што. Руся пагаджаецца, што спыніцца ў татуіраванні даволі цяжка.

— Я б не хацела рабіць сабе яшчэ таітуіроўкі. Але ж... вельмі хочацца!.. — смяецца спявачка. — Мяне папярэджвалі пра так званую «сінюю хваробу»: калі робіш адзін малюнак, пачынаеш уваходзіць у раж і хочацца яшчэ і яшчэ. Але я стараюся пра гэта не думаць, хоць лавіла сябе на тым, што прыглядала ўжо і месцы на целе, і новыя сімвалы...

«Наладзіць кантакт» з выявай

Ёсць пэўныя рэкамендацыі, якіх дзяўчына параіла прытрымлівацца тым, хто хоча зрабіць сабе тату.

— Мяне навучылі, як адчуць, якія малюнкі могуць быць «тваімі», як знайсці з імі кантакт. Трэба раздрукаваць упадабаную выяву і наклеіць на тое месца, дзе хочаце зрабіць тату. Паглядзець, ці пасуе гэта вам, ці не адчуваеце вы нейкага канфлікту з гэтым малюнкам. Калі я выбірала сімвалы для сябе, абвешала імі амаль усю кватэру, часам малявала маркерам на скуры на некалькі дзён. Проста прымусіла сябе з імі жыць цягам чатырох — пяці месяцаў, каб зразумець, ці не надакучаць яны мне праз некаторы час. Калі вы адчуеце, што выявы вам ужо абрыдлі, лепш адмовіцца ад іх. Акрамя таго, важна знайсці добрага майстра. Ну і апошняе — трэба выбіраць пару года для нанясення татуіроўкі: напрыклад, улетку не раяць гэтага рабіць.

Кансультацыя з урачом — не панацэя

Упрыгожваючы сваё цела выявамі, трэба заўжды памятаць пра магчымыя пабочныя эфекты. Чым можа «адгукнуцца» татуіроўка, напрыклад, з медыцынскага пункту гледжання, ведаюць дэрматолагі.

— Большасцю людзей татуіраванне пераносіцца нармальна, бо і інструменты, і фарбы, якія выкарыстоўваюць у тату-салонах, адпавядаюць пэўным стандартам і санітарным нормам, — распавядае **загадчык аддзялення Гарадскога клінічнага скурна-венералагічнага дыспансера г. Мінска Уладзімір ЯРОМІЧ.** — Але ўсё адно часам здараюцца парадаксальныя рэакцыі арганізма на татуаж, прадказаць якія немагчыма. Таму гэту касметычную працэдуру людзі робяць на свой страх і рызыку. Справа ў тым, што рэакцыя на яе ў кожнага чалавека можа быць розная. Небяспека заключаецца ў тым, што пад скуру ўводзяцца іншародныя фарбавальнікі, на якія можа ўзнікнуць алергія. Апроч таго, татуіраванне прадугледжвае траўматызацыю скуры, і невядома, як яна будзе сябе «паводзіць» пасля гэтага. Можа быць і такое, што на месцы маленькага ўколу з'явіцца ў некалькі разоў большы (так званы гіпертрафічны) рубец. Аднак і гэтая з'ява можа праявіцца не адразу, а праз некаторы час. Пры выкарыстанні неаднаразовых, нестэрыльных і недэзынфіцыраваных інструментаў узнікае рызыка заразіцца гепатытам С або іншым вірусным захворваннем. Адназначна супрацьпаказана рабіць татуіроўкі тым, хто мае хранічныя захворванні скуры, схільнасць да алергіі і да з'яўлення гіпертрафічных рубцоў. Акрамя таго, нельга рабіць татуіроўкі на радзімках і каля іх. Важна ўлічваць і тое, што з часам скура змяняецца — адпаведна, дэфармуецца і малюнак. Непазбежныя змены адбудуцца ў выяве і ў выпадку хірургічных аперацый. Таму перад тым, як зрабіць татуіроўку, трэба добра падумаць. Нават кансультацыя з урачом не стане панацэяй: ён толькі раскажа пра магчымыя наступствы. Зрэшты, пра іх павінны папярэджваць і ў тату-салоне.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.

Калі на тату — табу

А НА ПЛЯЧЫ «ГАРЫЦЬ» КЛЯЙМО...

Брытанскія навукоўцы ўстанавілі: «бяскрыўдныя» тату ў выглядзе матылька, а таксама армейскія татуіроўкі не перашкодзяць уладкаванню на работу, а вось малюнкі, якія асацыююцца са смерцю, наркотыкамі, расізмам і сексам, наадварот, адпужваюць працадаўцаў.

Яны папрасілі 15 кіраўнікоў кадравай службы 14 шатландскіх прадпрыемстваў, сярод якіх былі гасцініца, банк, муніцыпалітэт, турма, універсітэт і кніжная крама, расказаць, як яны рэагуюць, калі на субяседаванне прыходзіць татуіраваны суіскальнік, і ці возьмуць яны такога чалавека на работу.

«Вялікая частка рэспандэнтаў пагадзілася, што прыкметныя татуіроўкі — гэта «кляймо», — паведамілі даследчыкі. — Аднак найбольш важна, з пункту погляду кадравікоў, што падумаюць пра татуіраванага супрацоўніка кліенты, а не персанал.

Між іншым, сёлета ўпершыню ў конкурсе прыгажосці «Міс Амерыка» ўзяла ўдзел дзяўчына, супрацоўніца Нацыянальнай гвардыі. Левае плячо 22-гадовай Тэрэзы ўпрыгожвала эмблема зубаўрачэбнай службы сухапутных войскаў ЗША, а на правым было напісана «Малітва пра душэўны спакой».

У сваім блогу канкурсантка напісала, што не саромеецца дэманстраваць татуіроўкі, паколькі лічыць іх часткай сваёй асобы. Яна падкрэсліла, што дэманстрацыя малюнкаў на целе з'яўляецца своеасаблівым заклікам да іншых жанчын не баяцца быць сабой і змагацца са стэрэатыпамі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Без права на памылку

КАБ НЕ СПАЗНІЦЦА...

— Спыніцеся на наступным, калі ласка!
Звычайныя словы. Задумваешся і разумееш, што не да ўсяго яны падыходзяць. Спыніцца можна на прыпынку, ад якога некалькі хвілін да патрэбнага месца. Спыніцца можна іншы раз, каб азірнуцца на сваё жыццё. Спыніцца можна, закахаўшыся з першага погляду...

— А ці ведаеш, Волечка, якая мая любімая кніга?

— Дакладна не, але здагадваюся... Нешта з амерыканскай прозы.

— Так, — Дзяніс пацалаваў руку каханай.

— Назаві яе!

— Тэадор Драйзер, «Амерыканская трагедыя».

— Цікава...

Волечка, дзяўчына з блакітнымі вачыма, прывабіла хлопца гадоў пяць таму і ўвесь гэты час яны разам. Шчырасць у адносінах, цеплыня сустрэч, усё даволі сур'ёзна. Яна — мастак, ён — індывідуальны прадпрымальнік. Вольга стварае дабрабыт, Дзяніс — фінансава забяспечвае. Усё як і патрэбна быць. Сябры здзіўляюцца: як да гэтай пары яны не ажаніліся? Павінна быць якая-небудзь прычына таму. Магчыма, у іх каханні шлюб — не галоўнае? Магчыма, адзін з іх не гатовы да такога сур'ёзнага кроку? Магчыма, не час для гэтага?

...Калі б гэта была язда на матацыклах, усё было б зразумелым. А вось калі яна адчувае здраду, калі ад яго пахне іншай дзяўчынай, як быць? Умомант у вачах з'яўляецца злосць, а потым і слёзы. Такія яны, мужчыны: калі ідэальна і без прыгод, тады ім сумна. Новыя ўражанні патрэбны...

Хто ведаў, што Дзяніс не рабіў Вользе прапанову звязаць каханне пячаткай у пашпарце менавіта з-за з'яўлення той самай прычыны? Больш выгаднага шлюбу. Віной усяму грошы...

— Спыніцеся на наступным, калі ласка!

...Сустрэча ў рэстаране. Свечкі. Сервіроўка. Бакал віна і шклянка мінералкі. Нейкія салаты. Дзяніс сёння, менавіта сёння вырашыў расказаць усё. Волечцы таксама ёсць што сказаць.

«Мне патрэбна табе нешта важнае...» — пасля доўгага маўчання сказалі ў адзін голас. «Давай ты першы...» — уступіла Волечка.

З першых яго слоў злосць і крыўда пачалі раздзіраць яе на кавалачкі. Яе не хапіла да апошняга выслухаць. Падарваўшыся з месца, Вольга выбягае з рэстарана, не разбіраючы перад сабой нічога. Яна — ляцела. Куды падалей ад яго! Здраднік!...

— Спыніся! Спыніся!

На яго вачах яе збівае аўтамабіль... Спалоханы кіроўца. Людзі. Калі прыехала «хуткая», было ўжо позна. Удар быў моцны. Умомант. Лужа крыві. Насмерць.

Пасля Дзяніс даведаўся, што хацела Волечка яму паведаміць... Разам з ёй загінула дзіця, якому не лёс быў нарадзіцца... У такія моманты разумееш: ніякія грошы не вернуць назад час. Ніхто не заменіць каханага чалавека.

— Спыніцеся на наступным, калі ласка! — словы на аўтапілоце.

Кватэра. Дзверы. Ключы. Тэлефон аб сцяну. Вільготныя вочы. Без Волечкі...

Спыніцца можна, закахаўшыся з першага погляду. Але нельга спыніцца і абраць новае жыццё, змяніць мінулыя паводзіны, учынкі. Не ўсе гэта разумеюць. І Дзянісу спатрэбіўся вось такі «ўрок жыцця»...

Кацярына ЛЯСУН.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Жыццё анклава

КАЛІНІНГРАД: ДЗВЕ «КАРОНЫ» АДНАГО КАРАЛЯ

У розныя часы яго называлі па-рознаму. Жыхарам ВКЛ і Польшчы ён быў вядомы як Кролевец, самі прусы называлі яго Кёнігсбергам, што азначае «Кароль гары». І толькі ў савецкія часы яго «зрабілі» Калінінградам. Пасля капітуляцыі і заканчэння Другой сусветнай вайны савецкае кіраўніцтва дало суткі жыхарам Кёнігсберга на ўсеагульны выезд. Дазволілі застацца толькі тым, хто дапамагаў камуністам аднаўляць горад. Але нават гэтых немцаў хутка таксама выселілі. Нямецкія дамы з мэбляй і іншым «начыннем» засталіся пуставаць. Але такое становішча было нядоўгім. У хуткім часе пачалося засяленне мясцовасці жыхарамі з усяго СССР. Так у горада пачалася новая гісторыя.

Калі я ўпершыню пабачыла Калінінград, дык адразу ніколі б не сказала, што гэта рускі горад. Хоць зараз там і пражывае 80% расіян, ён не падобны на тыповы расійскі. Калінінград — гэта месца, дзе вечнае вельмі шчыльна «сябруе» з паўсядзённым.

Напэўна, цяжка яшчэ дзесьці пабачыць такую колькасць брукаваных дарог, як у Калінінградскай вобласці. Калі ў беларускіх гарадах брукаванка — гэта рэдкасць і сведчанне сталага ўзросту горада, то ў былым Кёнігсбергу гэта проста дарога. І ніхто не лічыць яе за нешта неверагоднае, не кажа: «У нас вуліцы, як у Празе», а выкарыстоўвае яшчэ нямецкую ручную працу, як кажуць, па прызначэнні — у якасці звычайных аўтамабільных і пешаходных дарог. Дарэчы, калінінградскія дарогі — гэта той яшчэ хаос! Нямецкія, вузкія, яны ніяк не падыходзяць да руху ў вялікім горадзе. Калі звычайна часпік бывае зранку і ўвечары, дык на гэтых дарогах часпік — перманентны. У гэтым плане Калінінград мне нагадаў «Барадзіно» Лермантава. Толькі там змешваліся «коні-людзі», а тут — «людзі-транспарт».

Непадалёку ад горада знаходзіцца Балтыйскае мора. Карыстаючыся выгадным становішчам, мясцовыя ўлады стварылі шматлікія курортныя гарадкі, пабудавалі дарагія атэлі. Але надвор'е ў гэтай мясцовасці капрызлівае і мора не такое цёплае, таму турыстаў тут мала: каму захочацца рызыкаваць і траціць час і грошы на непрадказальны адпачынак? Папулярнасцю курортны Калінінград карыстаецца пераважна ў «мясцовых».

Калінінград, як і любы балтыйскі горад, славіцца бурштынам. Тут вы можаце знайсці сонечны камень на любы густ, у любой апрацоўцы і, дарэчы, па вельмі невялікіх цэнах. У Калінінградзе знаходзіцца вядомы Музей бурштыну. Калі вы любіце разглядаць прыгожыя камяні,то гэта месца павінна абавязкова вас уразіць. У шматлікіх залах прадстаўлены віды самага разнастайнага бурштыну і расказваецца пра спосабы і гісторыю яго апрацоўкі.

Прымушае здзіўляцца наведвальніка анклава яго архітэктура. Уявіце сабе дамы XIX — пачатку XX стагоддзя. А цяпер уявіце іх праз сто гадоў без аніякіх змяненняў... Вось яны ў асноўным і складаюць забудову старога Кёнігсберга і ўсёй вобласці. У іх размешчаны крамы, заводы, школы і прыватнае жыллё. У некаторых з такіх дамоў дагэтуль няма выгод, вельмі неабходных сучаснаму чалавеку...

Падаецца, што горад з такой гісторыяй і культурай павінен мець вельмі шмат музеяў і помнікаў. На жаль, гэта далёка не так. Культурнае жыццё Калінінграда пачало аднаўляцца адносна нядаўна, бо пры савецкай уладзе гэты горад быў закрытай тэрыторыяй. І толькі ў наш час пры грашовай падтрымцы суседняй Германіі сталі аднаўляцца помнікі нямецкай архітэктуры. Так, у гістарычным цэнтры горада зараз функцыянуе Кафедральны сабор, які быў пабудаваны ў XIV стагоддзі. Там можна не толькі паслухаць арган, але і паглядзець выдатную музейную экспазіцыю. Таксама ў гэтым будынку створаны музей вядомага філосафа Імануіла Канта. А ў дворыку сабора знаходзіцца яго магіла.

Знакамітая «Каралеўская брама» таксама зусім нядаўна перастала нагадваць незразумелую пабудову з чырвонай цэглы. Тут створаны музей, з экспазіцыі якога можна даведацца, што ж уяўляў сабой Калінінград, калі быў яшчэ Кёнігсбергам.

З першага погляду Калінінград — горад шматканфесіянальны. Тут можна заўважыць і цэрквы, і касцёлы. Але мяне больш зацікавілі рэшткі пратэстанцкай культуры Кёнігсберга — кірхі. Паўразбураныя, старыя, яны «раскіданы» па ўсёй вобласці. Частка з іх працуе, некаторыя аддадзены пад касцёлы, а некаторыя так і застаюцца пуставаць.

Мясцовыя жыхары самастойна пачалі пазбаўляцца ад савецкай спадчыны. Напрыклад, у Гвардзейску — адным з гарадкоў вобласці — сталі рэканструяваць галоўную плошчу. Пакуль там панаваў хаос, нехта абліў помнік Леніну чырвонай фарбай. Каб схаваць такое відовішча, жыхары былі вымушаны вынесці былога правадыра па-за межы плошчы, паставіць яго на тратуары адной з вуліц і абматаць цэлафанам. Цікава, што нават на загорнутым помніку ляжаў адзін гваздзік — даніна памяці вялікаму кіраўніку рэвалюцыі.

Аднойчы пасля чарговай вандроўкі ў Калінінград мяне запыталі: «А можа, вярнуць гораду яго даўнюю назву — Кёнігсберг?». Напэўна, вярнуць яе і самрэч было б лагічна. Але гэтае пытанне ў Калінінградзе ніколі не ўздымалася, а значыць, яно мала каго клапоціць? Таму, пэўна, «Каралю гары» патрэбна змірыцца з яго новай пажыццёвай каронай.

Вікторыя ЧАПЛЕВА. Фота аўтара.

Асаблівасці «падземкі»

МЕСЦЫ ДЛЯ ЗАКАХАНЫХ І КАНТРАЛЁРЫ-«БОДЗІГАРДЫ»

Для многіх замежных турыстаў сапраўдная, а не экскурсійная Прага, пачынаецца са слоў: «Калі ласка, завяршыце выхад і пасадку, дзверы зачыняюцца». Ветлівыя словы на пачатку пражскіх канікулаў падбадзёрваюць і малююць у думках выдатны адпачынак у старадаўнім горадзе. Наш карэспандэнт не толькі захапляўся ў чэшскай сталіцы гатычнай архітэктурай, але і спусціўся ў пражскае метро, дзе ўбачыў на свае вочы «чорных пасажыраў», асілкаў-кантралёраў, адсутнасць турнікетаў і жэтонаў, якія ў пражскім метрапалітэне замяняюць звычайныя квіточкі.

Вагоны для... знаёмстваў

Што такое пражскі метрапалітэн? Гэта 59 кіламетраў звілістых тунэляў і практычных, як сцізорык-складанчык, платформаў, на якіх час ад часу можна ўбачыць чалавека з веласіпедам, што немагчыма ў нашым метро. Пражскі «андэграўнд» — гэта не мінімалістычная мінская падземка і не стакгольмскае метро, у якім даволі часта ладзяць мастацкія выставы, інсталяцыі і якое лічаць адным з найбольш густоўна аздобленых метрапалітэнаў у свеце.

Цікава, што пражскае метро адкрылі ў Дзень Перамогі. А дакладней, 9 мая 1974 года, у гадавіну вызвалення чэшскай сталіцы ад фашысцкіх захопнікаў. Заўважым, што мясцовы метрапалітэн камплектавалі дзякуючы савецкім пастаўкам. Так, для будаўніцтва лініі «А» з СССР у тагачасную Чэхаславакію паставілі эскалатары і 43 тысячы тон чыгунных цюбінгаў! Гэта было больш за 30 гадоў таму. Сёння пражскае метро за год можа перавезці ўжо амаль 600 мільёнаў пасажыраў. З творчымі падыходамі ў мясцовых метрапалітэншчыкаў, як пішуць чэшскія газеты, таксама ўсё добра. У хуткіх падземных электрычках да канца гэтага года павінны з'явіцца спецыяльныя вагоны для тых, хто яшчэ... не сустрэў сваё каханне. Вось і пойдуць хлопцы знаёміцца з дзяўчатамі не на дыскатэку ці Вацлаўскую плошчу, а ў метро — каб адправіцца ў рамантычнае падземнае падарожжа.

Дужыя мужчыны ў ладных касцюмах, як целаахоўнікі з амерыканскіх баевікоў, час ад часу патрулююць вестыбюлі метро, могуць чакаць цябе каля эскалатараў, зайсці ў вагон і з усмешкай, па-добраму, папрасіць квіток ці праязны.

Добры пасажыр — «белы» пасажыр

Але галоўная адметнасць пражскага транспарту — гэта квіткі на пэўны тэрмін праезду ў метро, трамваі ці аўтобусе. Адзіны тарыф дзейнічае на ўсе віды транспарту. І калі ты хочаш «пераскочыць» з метро ў трамвай, табе не трэба набываць новы білет: проста сачы, каб не скончыўся тэрмін дзеяння праязнога, які пазначаны на прабітым нізе паперчыны. А калі так сталася, прабівай другі, трэці ці чацвёрты — у залежнасці ад таго, колькі часу ты правядзеш у вагоне ці ў салоне аўтобуса. Адметна, што ў метро наогул адсутнічаюць турнікеты і чэргі па квіткі, як гэта звычайна бывае ў Мінску. Твой білет на ўваходзе ніхто не правярае. Усе зроблена так, каб ты камфортна змог праехаць з пункта А ў пункт Б. Зразумела, з квітком у кішэні. На «зайцоў», якіх на радзіме Карла Чапэка называюць «чорнымі пасажырамі», там ёсць свая ўправа — білетная інспекцыя. Дужыя мужчыны ў ладных касцюмах, як целаахоўнікі з амерыканскіх баевікоў, час ад часу патрулююць вестыбюлі метро, могуць чакаць цябе каля эскалатараў, зайсці ў вагон і з усмешкай, па-добраму папрасіць квіток ці праязны. А калі квіток ад цябе не атрымаюць, то папросяць заплаціць штраф у памеры 30 еўра. Ты, безумоўна, можаш сказаць, што нічога не разумееш, бо толькі з самалёта, чэшскую мову ніколі не чуў, як і не чуў пра тое, што ў метро таксама ходзіць кантралёр. Упэўнены, ты здзівішся, што імі ў Празе працуюць амаль культурысты. І ў гэты момант ты, напэўна, захочаш збегчы, бо навошта табе губляць 30 еўра... Аднак, за спінамі гэтых «бодзігардаў» ужо будзе стаяць хлопец са спецпадраздзялення, які ніколі не дазволіць табе стаць «героем».

Нягледзячы на падобную меру перасцярогі, «чорныя пасажыры» складаюць добрую колькасць наведвальнікаў метро. І падобная дэмакратыя прыводзіць да таго, што пражскае транспартнае прадпрыемства штогод губляе мільярды крон. З'явілася нават прапанова вярнуць у метро турнікеты, якіх там не было з сярэдзіны 1980-х. Можна толькі ўявіць, што адбывалася б у Мінску, калі б замест жэтонаў пачалі прадаваць квіткі і прыбралі ўсе турнікеты, бо нават у Чэхіі хапае ахвотных не плаціць за праезд. А таму, як у прымаўцы, «шануй чужое, але любі сваё». Нам і з жэтонам у кішэні ўтульна.

Тарас ШЧЫРЫ, фота аўтара.

г. Прага.

Па родным краі

ВЯЛІКІ КАМЕНЬ — СВЕДКА ДАЎНІНЫ

Ад вёскі Кальчуны дарогі і сцежкі, «пратаптаныя» нашымі продкамі, па-ранейшаму дазваляюць праехаць у Літву, Гродна, Ашмяны, наведаць суседнія невялічкія мястэчкі. Калі пайсці па адным з такіх шляхоў, трапіш у Гароднікі, дзе на мясцовых могілках пахаваны вядомы ўрач і вучоны Енджэй Снядзецкі, пойдзеш другім — завітаеш у старажытныя Гальшаны, а на трэцім, самым вузкім, — сустрэнешся з цудам прыроды — вялікім каменем.

У Ашмянскім раёне знойдзена шмат розных па памерах камянёў: і невялікіх, і вялізных. Нават назва горада Ашмяны ў перакладзе з літоўскай мовы азначае «камень». Калі наведаешся ў горад па старой брукаванай дарозе з боку Вільні, то спадарожніка сустракае камень з высечаным годам заснавання горада. Яшчэ адзін валун ляжыць каля школы-інтэрната. Да Нявесцінага каменя, што паблізу Навасёлак, ніколі не зарастае сцяжынка. Сюды ідуць дзяўчаты, каб загадаць жаданне і ў хуткім часе знайсці каханага чалавека, пабрацца з ім шлюбам.

Сама ж вёска Кальчуны знаходзіцца паміж Гароднікамі і Сякераўцамі, і менавіта ў лесе, які злучае гэтыя два паселішчы, ляжыць вялікі валун — «след» ледавіковага перыяду. Кажуць, нібыта пад валуном тым закапаны скарб, пакінуты самім Напалеонам. Даўным-даўно гэты камень ляжаў на гары, але ахвотнікаў знайсці скарб было вельмі шмат. Капалі, хацелі ўзарваць, спрабавалі зрушыць з месца, вывезці на адкрытае месца, але дарэмна. Наадварот, камень сам сябе стаў закопваць, «лезці» ў зямлю. Старажылы ўспамінаюць, што начамі на тым месцы гарэў агеньчык. Адны думалі, што нехта шукае скарб, другія разважалі, што святло ўказвае на таямніцу.

Трапіць на сцежку і знайсці валун — задача складаная. Ходзіш, блукаеш, ды

Фота Аляксандра НАВУМЧЫКА.

ніяк не знаходзіш! А ён тут, побач, зусім блізка — толькі ўнізе. Быццам гуляе з табой у хованкі! Вядомы і яго памеры: у вышыню валун дасягае 3,2 м, шырыня — 3,4 м, даўжыня — 4,1 м. Аб'ём — больш за дваццаць кубічных метраў. Важыць гэты цуд прыроды больш за 60 тон. На адным з бакоў валуна высечаны крыж памерам 10х13 см.

Існуе легенда, што чацвёра невядомых у 1924-1925 гадах адкапалі скарб, які знаходзіўся пад каменем, і вывезлі. Але карысці ён ім не прынёс — толькі адно гора. Людзі загінулі, скарб знік, а камень застаўся ляжаць. Толькі на ім з'явіўся крыж. Цяпер валун ужо не спакушае людзей шукаць скарб, але паранейшаму прыцягвае да сябе нейкай магічнай, толькі яму вядомай сілай.

Мінае час. А людзі не забыліся пра гэты камень. Прыходзяць сюды і малыя, і старыя. Проста паглядзець і падзівіцца. Некаторыя вядуць з ім нават шчырыя сяброўскія гутаркі.

Так і не далі людзі назву гэтаму валуну. Для нас ён проста — «Вялікі камень».

Інга ГІЗ, вучаніца Кальчунскай школы Ашмянскага раёна.

SEX–БАЛЯСЫ

ЭХ, ТЫ, ЁЛКІ... АЛКІН!

...Не ведаю, як каго, а мяне навіна пра нараджэнне ў Алы Пугачовай і Максіма Галкіна двойні ад сурагатнай маці — хлопчыка і дзяўчынкі — шакіравала. Свой артыкул пішу літаральна па «гарачых слядах» (хаця паведамляецца, што блізняты нарадзіліся яшчэ 18 верасня, проста пра падзею толькі зараз стала вядома), таму ўсё яшчэ не пакідае думка, што гэта розыгрыш, нейкі недарэчны жарт... Зрэшты, здаровы сэнс падказвае, што такімі рэчамі не жартуюць, таму навіну трэба ўспрымаць як данасць. Трэба, але нешта, прабачце, перашкаджае...

Давайце дамовімся адразу: дзеці — святое. Гэта нават надалей не абмяркоўваецца і не падлягае сумневу. Нездарма ж кажуць, што яны — кветкі жыцця. Нешта не тое, як мне бачыцца, адбываецца не з імі, а з іх бацькамі. «Зорнымі» бацькамі, якіх, як і «звычайных», таксама не выбіраюць...

Не трэба нават браць да ўвагі далёкіх замежных «зорак»: за апошнія гады многія расійскія прадстаўнікі шоу-бізнесу дзякуючы сурагатнаму мацярынству сталі бацькамі. Напрыклад, гэтага не ўтойвае папулярная ў 1990-я гады спявачка Алёна Апіна, у якой такім чынам яшчэ ў 2001 годзе нарадзілася дачка. Згодна з паведамленнямі сродкаў масавай інфармацыі, і ў цяпер яшчэ «дзеючага» (тут я найперш пра спевы, пра нястрачаную вядомасць) Валерыя Лявонцьева з'явілася дачка таксама ад сурагатнай маці — у 2010 годзе. Ну і самы вядомы бацька дваіх сурагатных дзяцей, вядома, Філіп Кіркораў! Вядомы найперш таму, што, магчыма, больш за іншых «зорных» бацькоў па справе і без любіць «прапіярыцца» на гэтым фоне. Можа, ён і не хоча так рабіць, але ў выніку ўсё атрымліваецца як заўсёды: ад празмернай дэманстрацыі яго любові да Алы-Вікторыі і Марціна вее нейкай нацягнутасцю і штучнасцю. Таму, напэўна, невыпадкова Філіп стаў аб'ектам жартаў для Клуба вясёлых і знаходлівых. Каманда Маскоўскага дзяржаўнага інстытута міжнародных адносін «Парапапарам» нават прысвяціла яму цэлую песню, дзе ёсць словы ад імя як быццам бы шматлікіх дзяцей Кіркорава: «*Почему так жесток мир?/ Почему наша мать — отец?/ Почему наш отец — мать?/ Почему они оба — Филипп?/ Не пойму, как отец живёт/ Почему всё не как у людей?*»

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

...Паведамляецца, што народжаныя блізняты — гэта біялагічныя дзеці 64-гадовай Алы Пугачовай і 37-гадовага Максіма Галкіна. Як той казаў, свечку ніхто не трымаў. У тым сэнсе, што сёння (дакладней, пра гэта трэба было паклапаціцца ўчора) сучасныя тэхналогіі дазваляюць замарозіць жаночую яйцаклетку (вы ж разумееце, чаму менавіта пра гэта гаворка), і, у прынцыпе, яно сапраўды магло быць менавіта так. Толькі дазволю сабе задаць пытанне... Па магчымасці, далікатна: а навошта? Кожны, вядома, сам уладар свайго лёсу... Толькі калі б «зорная» пара вырашыла ўсынавіць ці ўдачарыць дзіця, гэта было б такой маральнай падтрымкай для прыёмных сем'яў, дзіцячых дамоў! Не кажучы пра ўладкаваны лёс канкрэтных дзетак, што маглі патрапіць у сям'ю. Пагадзіцеся, Пугачову — маці і бабулю — ніхто б ніколі не змог папракнуць у тым, што яна не выканала свайго жаночага прызначэння. І зараз спявачка магла проста працягваць радаваць прыхільнікаў сваёй творчасці або са спакойным сумленнем «спачываць на лаўрах».

Выходзіць, справа ў Галкіну?.. Навіна пра нараджэнне дзяцей праз сурагатнае мацярынства суправаджалася ў сродках масавай інфармацыі каментарыем: маўляў, гэта — адказ яго і Пугачовай журналістам і нядобразычліўцам, якія сцвярджалі, што ў «зорнай» пары намеціўся разлад і ўсё можа скончыцца скасаваннем шлюбу. Тыя чуткі пазней Максім у эфіры абверг, але, пагадзіцеся, справы — лепш за словы... Не, ніхто не аспрэчвае, што ў яго там нешта не «страляе»... У сілу аб'ектыўных прычын (калі пара сапраўды пажадала мець дзяцей) усё трэба было рабіць так, як і было зроблена. Але, на мой погляд, не мае асаблівага значэння: было гэта «выратаваннем сям'і» ці ўзважаным рашэннем. Бо справа якраз у дзецях, якія, як было сказана вышэй, бацькоў не выбіраюць. Калі з Галкіным яшчэ ўсё нічога (37 год — узрост адносна малады), як Пугачова будзе праз некалькі гадоў тлумачыць Гары і Лізавеце (так быццам бы назвалі нованароджаных) свой узрост?.. Колькі ён дазволіць займацца іх выхаваннем? Між тым, гэтая «міна запаволенага дзеяння» была закладзена першапачаткова з-за істотнай розніцы ва ўзросце сужэнцаў... Дзеці, упэўнены, і належную адукацыю атрымаюць, і ў жыцці будуць уладкаваныя, ды і талентамі, Бог дасць, пахваліцца змогуць. Толькі ці хопіць ім часу адчуць радасці сапраўднага дзяцінства — разам з бацькамі?..

Яны — людзі публічныя, што прызвычаіліся да ўсеагульнай і пастаяннай увагі. Магчыма, ужо нават на падсвядомым узроўні: калі яны вонкава шчаслівыя, значыць, напоўніцу і ва ўсім.

У рэшце рэшт, справа не ў канкрэтных прозвішчах вядомых людзей. У іх ёсць слава, ёсць грошы. Нягледзячы на гэта, «зоркі», напэўна, шчаслівыя або не ў той жа самай ступені, што і мы з вамі. Толькі яны — людзі публічныя, што прызвычаіліся да ўсеагульнай і пастаяннай увагі. Магчыма, ужо нават на падсвядомым узроўні: калі яны вонкава шчаслівыя, значыць, напоўніцу і ва ўсім. Напэўна, адсюль ідзе гэтае следаванне вядомаму «пасадзіць дрэва, пабудаваць дом, вырасціць дзіця»? Але дрэў на дачным участку ўжо — цэлы сад. Кватэры, загарадныя дамы (замкі) — куплены-пабудаваны і сабе, і нашчадкам. Што застаецца?..

Тое, што «маладых» бацькоў кінуліся віншаваць іх родныя і сябры, — цалкам натуральна і па-чалавечы зразумела. Праўда, ведаючы норавы «вышэйшага свету» (тое, што нам дазваляюць ведаць), вельмі не хацелася б, каб нараджэнне такім чынам дзяцей пераўтварылася для бамонду ў такую своеасаблівую «модную тэму»...

Невясёлая размова атрымалася, згодны. Але гэта не той выпадак, калі трэба «сцябацца». Паколькі гаворка — пра дзяцей...

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

ПАЗНАЁМІЦЦА ЗА... ПЯЦЬ ХВІЛІН...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Для чаго на «хуткія спатканні» ідуць дзяўчаты? Пэўна, з тымі ж мэтамі, што і прадстаўнікі моцнай паловы чалавецтва. Памятаеце, як у той песні пра фабрычных дзяўчат, якія «с парнями встречаются». Прынамсі, у вачах удзельніц я заўважыла цікаўнасць. А яшчэ, як падалося, спадзяванне знайсці сваё шчасце... «Иногда из этих встреч что-то получается». Дарэчы, «кошт надзеі» — 170 тысяч рублёў.

...Мне выдалі бэйдж і пасадзілі за столік. Каб ацэньваць новых знаёмых, прапанавалі «карту сімпатый». У ёй былі пайменна пазначаны адзінаццаць хлопцаў, а насупраць — тры калонкі: «рамантычнае спатканне», «сяброўскія стасункі», «дзелавыя стасункі». Пасля знаёмства кожнаму хлопцу (дзяўчыне) трэба было паставіць «птушачку» насупраць канкрэтнага імені, выбраўшы характар стасункаў з патэнцыяльным партнёрам. Потым гэтыя карты збіраюцца і аналізуюцца арганізатарамі, а вынікі супадзенняў або несупадзенняў сімпатый дасылаюцца на электронную пошту кожнаму ўдзельніку. Калі сімпатыя аказалася ўзаемнай, то хлопцы і дзяўчаты атрымліваюць нумары тэлефонаў адно аднаго.

...Дзяўчаты чакалі свайго часу «ікс» у зале для спатканняў. Хлопцы круціліся перад люстэркам у холе. Як патлумачылі арганізатары, гэта зроблена наўмысна дзеля таго, каб падоўжыць момант хваляванняў, з аднаго боку, і даць магчымасць дзяўчатам падрыхтавацца як след — з другога. Напрыклад, адна ўдзельніца нават пачала раіцца, як ёй лепш... сесці, каб у хлопцаў быў «добры агляд».

Пакуль падфарбоўвалі вусны, дзяўчына-фатограф падглядвала ў шчылінку і каментавала: «Ой, там валасаценькі ёсць! Такі харошанькі!»

Я загадзя падрыхтавалася весці «стральбу вочкамі» і «лёгенька хіхікаць». Але маю стратэгію зруйнаваў сваім пытаннем першы ж хлопец: — Як вы ставіцеся да астрафізікі?

Дзяўчына, якая клапацілася, як ёй лепш сесці, вельмі хвалявалася наконт знешнасці будучых прэтэндэнтаў:

— Парадуй, скажы, што нікога барадатага няма....

Гадзіннік паказваў ужо 20.25 (пачатак быў прызначаны на 20 гадзін). «Мужчыны затрымліваюцца», — ветліва патлумачылі арганізатары. Нехта з дзяўчат прапанаваў пагуляць, а нехта — саставіць сталы і зладзіць «дамскі клуб» з гарбаткай.

...Нарэшце наступіў доўгачаканы момант: дзверы адчыніліся і ў залу зайшлі адзінаццаць «добрых малайцоў». Я загадзя падрыхтавалася весці «стральбу вочкамі» і «лёгенька хіхікаць». Але маю стратэгію зруйнаваў сваім пытаннем першы ж хлопец:

— Як вы ставіцеся да астрафізікі?

Наступныя пяць хвілін я слухала аповед пра калапс і ўнутрыядзерныя працэсы... У гэты час у галаву прыйшла думка пра тое, што не адна я прыйшла сюды НЕ з мэтай пазнаёміцца...

Далей усё пайшло даволі лёгка і весела. Прыемна было назіраць, як па чарзе падсаджваюцца ўсё новыя і новыя хлопцы. З кімсьці было сумна, а з некім можна было так забалбатацца, што нават не пачуць званочка, які азначаў, што хлопцу

Фота з сайта «хуткіх спатканняў» у Мінску.

надышоў час перайсці да іншай дзяўчыны.

...На адным дыханні прайшло пяць спатканняў. Потым я ўжо была салідарная з хлопцамі, якія, падсаджваючыся да мяне, мармыталі з вінаватай усмешкай: «Ой, колькі ж яшчэ вас?» Праўда, пяціхвілінныя

Пакуль падфарбоўвалі вусны, дзяўчына-фатограф падглядвала ў шчылінку і каментавала: «Ой, там валасаценькі ёсць! Такі харошанькі!»

спатканні аказаліся досыць карысныя, бо суразмоўцы ў большасці сваёй, траплялі цікавыя. У асноўным, як і казалі арганізатары, гэта былі «IT-шнікі». Але сустрэліся і экананіст, і дызайнер, і нават бармен. Я даведалася, напрыклад, як гатуецца мяса па-татарску, як распрацоўваюцца камп'ютарныя гульні і дзе лепш адпачываць у Крыме. Асабліва не думаючы, я ставіла амаль усім «птушачку» ў калонцы «сяброўскія стасункі». Дарэчы, заўважыла, што не ўсе хлопцы так легкадумна падыходзілі да ацэньвання дзяўчат. Перад тым, як паставіць сваю «птушачку», некаторыя задуменна глядзелі ў твар, пыхкалі, па некалькі разоў перачытвалі назвы калонак, а ўжо потым старанна «заносілі» мяне ў адну з іх.

Думаю, не ўсе яны прыйшлі на мерапрыемства з мэтай знайсці сабе сяброўку на ўсё жыццё. Мне падалося, што можна вылучыць тры катэгорыі хлопцаў, якія — кожны па сваёй прычыне — вырашылі наведаць імпрэзу. Перш за ўсё гэта тыя, хто прыйшоў проста дзеля цікавасці, добрага баўлення часу і асабістага «паказу». Прыклад з «астрафізікам» не адзіны. Быў хлопец, які вельмі хацеў падацца неадукаваным беспрацоўным маргінальным чалавекам. Размаўляючы на жаргоне, ён назіраў, як я на гэта адрэагую. Толькі пасля даведалася пра яго вышэйшую адукацыю, добрую працу і неблагі кругагляд.

Другая катэгорыя — гэта насамрэч тыя, хто шукае сабе «палову». З большасцю размаўляць было прыемна. Але знаходзіліся і хлопцы, якія лічылі, што дзяўчаты павінны глядзець на іх як на «прынцаў». Яны ладзілі своеасаблівыя праверкі таго, ці хлушу я ім. Прытым самі прызнаваліся, што проста правяраюць, а пасля глядзелі на маю рэакцыю. І калі яна ім падабалася, то задаволена ўсміхаліся і пераходзілі ўжо на менш «афіцыйную» частку размовы. У гэтых хлопцаў загадзя былі падрыхтаваны пытанні кшталту: «Як часта дзяўчаты ідэалізуюць свайго першага хлопца?», «Ці часта ты першая знаёмішся з хлопцамі?», «Якія пытанні ты хочаш задаць, каб лепш мяне ведаць?». А адказы на гэтыя пытанні стваралі, як сказаў адзін з суразмоўцаў, «псіхалагічны партрэт».

А вось для чаго прыйшла трэцяя катэгорыя ўдзельнікаў, для мяне так і засталося загадкай, бо, акрамя «прывітанне», яны больш нічога не маглі сказаць. У адказ на мае ветлівыя пытанні я атрымлівала ківок галавой, у лепшым выпадку — нейкае мармытанне. З адным мужчынам (узрост якога значна пераважаў межы пажаданага) мне надакучыла маўчаць, таму я стала расказваць пра дзіркі ў азонавым слоі і як яны ўплываюць на наша здароўе (літаральна напярэдадні па заданні рэдакцыі была на прэс-канферэнцыі, прысвечанай гэтай тэме). На здзіўленне, мой суразмоўца загаварыў:

— Гэта немагчыма! Немагчыма, што вы гэта ведаеце! Мне на мінулым тыдні літаральна тое ж самае расказваў мой сябра! Гэта неверагодна!

Ну што ж, прынамсі, высветлілася, што мой суразмоўца можа падтрымліваць дыялог. Вядома, бываюць і сарамлівыя людзі. Але калі ўжо ісці на такога кшталту спатканні, дык дакладна не з думкамі, што вас там будуць забаўляць. Каб добра правесці час, вы самі павінны прынесці з сабой адпаведную атмасферу. А супрацьлеглы пол з радасцю яе з вамі падзеліць.

...На адным дыханні прайшло пяць спатканняў. Потым я ўжо была салідарная з хлопцамі, якія, падсаджваючыся да мяне, мармыталі з вінаватай усмешкай: «Ой, колькі ж яшчэ вас?»

...Пасля нялёгкіх адзінаццаці спатканняў арганізатары сабралі ва ўсіх «карткі сімпатый» і хутка вызначылі самых папулярных у гэты вечар хлопца і дзяўчыну. Шчасліўчыкаў павіншавалі і ўручылі невялікія падарункі. Пасля «афіцыйнай» часткі пераможцы селі разам за столік і абмяняліся нумарамі. Я паглядзела ў залу, у якой, акрамя іх, засталіся дапіваць свой сок адны дзяўчаты, і ўздыхнула: «Ну хоць хтосьці знайшоў адно аднаго».

❍❍❍

Праз суткі на маю электронную пошту прыйшла табліца сумяшчальнасці. З некалькімі хлопцамі ў мяне супалі погляды на сяброўскія стасункі. Праглядаючы вынікі, я пашкадавала, што нідзе не пазначыла «рамантычнае спатканне». Станоўчых эмоцый, пэўна, было б яшчэ больш...

Вікторыя ЧАПЛЕВА.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказны за выпуск — першы намеснік галоўнага рэдактара Наталля КАРПЕНКА.
Адрас рэдакцыі:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактны тэлефон: 292 44 12.
e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013,
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 23.184.
Нумар падпісаны ў 19.30 9.10.2013 г.

■ Крытыка на шпільцы

ЧАЛАВЕК, ЯКІ АДКРЫЎ БЕЛАРУСКУЮ АТЛАНТЫДУ

Сучасныя беларусы добра ведаюць не толькі імёны, але і акалічнасці жыцця знакамітых навукоўцаў свету. Энштэйн і Тэсла, Паскаль і Кюры-Складоўская, Фрэйд і Шліман — яны для некаторых беларусаў па адчуванні блізкія, амаль што сваякі ці суседзі. І вельмі мала хто ведае імёны знакамітых беларускіх навукоўцаў. Тым не менш побач з намі былі і ёсць знаўцы, чый інтэлект, веды, шырыня поглядаў, уменне шукаць і знаходзіць, не саступаюць «зоркам» навукі сусветнага ўзроўню.

Калі б мяне спыталі: «Хто для вас узор навукоўца, ідэальны вучоны?», то без затрымкі назвала б імя Генадзя Кісялёва. Літаратуразнаўца, гісторык, архівіст, чалавек, які, па сутнасці, адкрыў для нас усю беларускую літаратуру XIX стагоддзя, бо да яго даследаванняў практычна не існавала гэтай культурнай з'явы менавіта як цэласнай, паўнавартаснай карціны. На яго рахунку сотні ўзноўленых імёнаў і тэкстаў, рэканструяваных падзей і біяграфій... Але, у першую чаргу, Кісялёў — апавядальнік, чалавек, які расказвае пра мінулае так, што ад гэтых гісторый немагчыма адарвацца. Ты ў іх ужываешся, спачуваеш іх героям, ненавідзіш іх ворагаў... Ты плачаш над несправядлівасцю лёсу і пачынаеш верыць ва ўваскрашальную сілу кахання... Але самае неверагоднае — ты забываеш, што гэтых людзей няма на свеце! Смак той далёкай эпохі так ярка і востра перададзены Кісялёвым, што, гартаючы старонкі, ты і блізка не помніш, што гэта навука, а не мастацкі твор!

Выхад кнігі «Смак Беларушчыны», куды ўвайшлі два зборнікі артыкулаў гэтага знакамітага падарожніка па дарогах мінулага, ёсць цудоўны падарунак для тых, хто неабыякавы да Беларушчыны. Пяцісотстаронкавае выданне змяшчае два зборнікі артыкулаў — «Радаводнае дрэва», які ўжо выходзіў у 1994 годзе і, не пабаюся гэтага вызначэння, стаў пуцяводнай зоркай для цэлага пакалення беларускіх гісторыкаў, і «Смак Беларушчыны», які раней не выдаваўся.

Безумоўна, асаблівую цікавасць уяўляе гэтая другая частка кнігі, якая змяшчае такую колькасць навуковых адкрыццяў, што іх, без перабольшвання, хапіла б на цэлы даследчы інстытут. Не здзіўлюся, калі ў будучым гэтыя тэксты, якія сам аўтар вызначыў як «кверэнды», будуць расцягнуты беларускімі пісьменнікамі на сюжэты гістарычных раманаў. Ёсць што цягнуць! Тым больш што Кісялёў ніколі не быў філісцёрам, сухім занудным навукоўцам, а ўмеў пісаць жывой, вобразнай мовай, той мовай, якой карыстаюцца вандроўнікі, авантурысты і пісьменнікі прыгодніцкіх жанраў. У кверэндзе «Фантомы тайных архіваў» даследчык піша пра героя паўстання 1863 года Зыгмунта Мінейку: «Так што аўтар ліста вока мае вострае, нюх выдатны, умеў бачыць (нават прадчуваць) буйных, каларытных, неардынарных людзей». Такое ўражанне, што захапіўшыся сваім героем Кісялёў апісаў сябе! Дарэчы, гэты самы згаданы Зыгмунт уцёк з сібірскай катаргі і стаў ганаровым грамадзянінам Грэцыі — чым не герой рамана ці прыгодніцкага фільма?

Аднак, што цікава, у новай кнізе Кісялёва ёсць не толькі ідэальныя героі... Час не меў бы сапраўднага смаку без солі і горычы. І такой — не заўсёды прыемнай, але важнай і патрэбнай нотай у кнізе — сталі партрэты антыгерояў: здраднікаў, даносчыкаў, шпіёнаў. Вось чытаем пра такога: «Ясна, што гэта не даносчык-аматар (хапала і такіх ва ўсе часы), а нейкі тайны агент, платны супрацоўнік III аддзялення. (Пішучы пра небяспеку, «Уладзімір», магчыма, проста набіваў сабе цану.) Хто ж менавіта? Тайная агентура не раскрывалася, спасылацца на сапраўдныя імёны не было прынята... Аднак пачакайце. На аркушы 7 той самай справы жандары ўсё ж прагаварыліся, пазначыўшы сабе для памяці: «...извлечены из письма Бернацкого». Вось вам і прозвішча шпіка».

Наогул, гэты неверагодны для беларускай сучаснай навукі жанр росшукаў — «кверэндаў» — патрабуе асобнага слова. І хочацца, каб гэта было жывое і трапнае слова самога Генадзя Кісялёва.

«Генералы хваляцца выйгранымі бітвамі, даследчыкі вядуць рахунак знаходкам, радуюцца адкрыццям, калі яны здараюцца, плённым думкам, гіпотэзам.

Ці не самы прыцягальны для мяне жанр — пошук. Тут пачуваюся найбольш упэўнена. Калі расказваю пра перыпетыі пошукаў, пра шлях да знаходкі, адчуваю, як мае ветразі напаўняюцца спрыяльным спадарожным ветрам. Гучнае, як заўсёды, загадкава-ўзнёслае лацінскае слова «quaerenda» азначае «рэч, якую шукаюць». Так ці амаль так (kwerenda) нашы бліжэйшыя суседзі і партнёры па гісторыі палякі называюць вучоныя пошукі ў архівах і бібліятэках. Здаецца, ці не ўсё жыццё захапляюся такімі раскопкамі-расследаваннямі, але доўга не ведаў, што займаюся «кверэндамі».

Хачу, каб гэтае ўпадабанае адметнае слова прагучала і па-беларуску. Тым больш што нашы адукаваныя продкі з імпэтам грызлі і лаціну, і пальшчыну.

А што да «шуканай рэчы», мэты пошукаў, то для мяне, як і для ўсіх нас, гэта заўсёды наша Беларусь, яе гісторыя, культура і літаратура, яе вызвольны і нацыянальны рух і стасункі з суседзямі.

Шалёныя хвалі гісторыі б'юць у раз'едзеную часам і нягодамі Выспу Беларушчыны. Мацуйма яе берагі».

Складана сказаць, ці набудзе працяг у нацыянальнай навуцы гэты рамантычны, узнёслы, захапляльны жанр. Але хочацца спадзявацца што пад ветразем новай кнігі Генадзя Кісялёва ў нас з'явіцца чарговае пакаленне чытачоў, адданых светлым ідэалам Беларушчыны.

Ганна КІСЛІЦЫНА

Міжнародны «Віцебскі лістапад»

Нязменным спадарожнікам восені ў Віцебску з'яўляецца фестываль аўтарскай песні «Віцебскі лістапад» — адзін з найстарэйшых на тэрыторыі былога СССР. Вось ужо 26 разоў гэты беларускі бардаўскі форум збірае аўтараў-выканаўцаў, музыкантаў, паэтаў з розных краін свету.

— І ў чарговую «лістападаўскую» восень будуць прадоўжаны фестывальныя традыцыі. У канкурсантаў ёсць магчымасць пазмагацца за званне лаўрэатаў у трох намінацыях: аўтар, выканаўца, дуэт. Прыём заявак на ўдзел ажыццяўляецца да 15 кастрычніка (уключна) па адрасе: Віцебск, вуліца Маякоўскага, дом 1, каб. 14. Узор заяўкі можна знайсці на сайце www.gck.by. Першае конкурснае праслухоўванне пройдзе 19 кастрычніка ў Цэнтры культуры «Віцебск» . Члены журы, вядомыя барды, вызначаць пераможцаў. Але імёны апошніх будуць агучаны толькі на наступны дзень: 20 кастрычніка ў тым жа Цэнтры культуры «Віцебск» адбудзецца гала-канцэрт «Музычны праспект», — паведамілі ў аргкамітэце фестывалю. У другім аддзяленні гала-канцэрта выступяць вядомыя барды: Марыя Грушнік (Мінск), Алеся Мядзведзева, Міхаіл Рубін (Віцебск), Наталля Салаўёва (Гродна), Міхаіл Башакоў (Санкт-Пецярбург) і іншыя. У рамках фестывалю пройдзе сольны канцэрт «У старым горадзе» Андрэя Каралёва — віцебскага спевака, паэта, кампазітара, удзельніка шматлікіх музычных конкурсаў і тэлевізійных праектаў. А ў канцэрце «Восеньскія матывы» возьмуць удзел запрошаныя артысты з Мінска, Брэста, Баранавічаў, Гродна, Оршы, іншых гарадоў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ, тэл. 287 18 27. № 30 (488)

МАСТАЦТВА КАМБІНАВАННЯ РАСЛІН

Чым растлумачыць, што пры прыблізна аднолькавым складзе «ўдзельнікаў» адны кветнікі выклікаюць захапленне, а іншыя пакідаюць абыякавымі?

Сакрэт поспеху складаецца ва ўмелым камбінаванні раслін рознай вышыні з рознымі формамі росту, а таксама ў знаходжанні эфектных рашэнняў па спалучальнасці афарбовак кветак і лісця.

Але ёсць яшчэ адна тонкасць: у прыгожых кветніках, як правіла, асартымент раслін аднымі травяністымі мнагалетнікамі не абмяжоўваецца, найбольш удалыя не абыходзяцца без кустоў, цыбульных і адналетнікаў.

Калі вы задумалі разбіць змяшаны кветнік, сэканоміць на плошчы не атрымаецца. У залежнасці ад велічыні кустоў, выбраных для пасадкі, яго шырыня будзе складаць 1,5—3 м.

Калі ж з-за невялікіх памераў участку кветнік вельмі абмежаваны па плошчы, варта вызначыць час, на які ў ім будзе прыпадаць пік цвіцення, падабраўшы адпаведныя расліны.

І толькі на вялікіх плошчах (не меней за 20 кв. м) дзякуючы правільнаму падбору раслін і ўмелай расстаноўцы «сіл» можна стварыць кветнік, які будзе захоўваць прывабны выгляд круглы год.

Першы этап — кусты

Незалежна ад памераў будучага кветніка пасадкі пачынаюць з кустоў, якія павінны ўтварыць так званы шкілет. Пры падборы культур неабходна арыентавацца на меркаваную вышыню і аб'ём дарослай расліны.

Да ліку найбольш прывабных кустоў, якія прыгожа цвітуць і нават пасля некалькіх гадоў не парушаць межаў кветніка, адносяцца язмін, дуброўка кустовая, бэз і шматлікія віды спірэі.

Вечназялёныя дрэвы і кусты — «матэрыял» ідэальны. І сярод іх самшыт — расліна нумар адзін: з дапамогай абразання ёй можна надаць любую форму і задаць патрэбную вышыню. Цікавымі каляровымі акцэнтамі ўзбагаціць карціну ў кветніку чырваналісты барбарыс, які дастаткова лаяльна ставіцца да абразання.

Другі этап — мнагалетнікі

Услед за кустамі высаджваюць травяністыя мнагалетнікі. Паколькі для невялікіх кветнікаў іх выбар змушана абмежаваны ўсяго толькі некалькімі відамі, стаўку лепш рабіць на такія даўгацветы, як карэопсіс, многакалоснік, эхінацыя і лаватэра: яны будуць «трымаць кампазіцыю» з ліпеня па верасень (а лаватэра — нават да кастрычніка).

Адмысловае значэнне мае таксама дэкаратыўнасць лісця, і ў першую чаргу для раслін, кветкі якіх недаўгавечныя, напрыклад, як у герані. Нязменна эфектна глядзяцца ў змяшаных кветніках серабрыстае лісце палыну і цёмна-чырвоныя гейхеры.

Адналетнікі і цыбульныя — для паўнаты карціны

Пустэчы паміж групамі мнагалетнікаў можна запаўняць на працягу ўсяго сезона пярэстымі адналетнікамі. Увесну кветнік па краі эфектна ўпрыгожаць стакроткі і фіялкі рагатыя. А ўлетку — ажурныя кветкавыя воблачкі вербены.

Зрабіць кветнік яшчэ прыгажэйшым дапамогуць восеньскія пасадкі цыбульных. Тады ўвесну, калі травяністыя мнагалетнікі толькі-толькі пачнуць прачынацца, мускары, крокусы і нарцысы ўжо расквецяць зямлю свежымі фарбамі. Для ўзмацнення дэкаратыўнага эфекту высаджваць іх лепш групамі.

ЗАХОЎВАЕМ КАПУСТУ

Тэрміны захоўвання капусты зімой залежаць ад часу паспявання. Сярэднярання капуста можа захоўвацца месяц ці крыху больш. Сярэдняспелая звычайна захоўваецца да сярэдзіны студзеня і нават можа даляжаць ды лютага. Сярэдняпозні гатунак можа выдатна дачакацца пачатку вясны. Але лепш за ўсё на захоўванне пакідаць познія гатункі капусты.

Веды аб тым, як захоўваць капусту зімой, пачынаюцца з правільнага збору ўраджаю. Гэта выкопванне і выдаленне лішкаў зямлі. Пачынаюць збіраць капусту ў канцы восені, выбіраючы сонечны дзень. Акуратна, з дапамогай рыдлёўкі, дастаюць з зямлі і счышчаюць зямлю з храпкі. Тут самае галоўнае — не спяшацца зрэзаць храпку пад самы корань: яна можа яшчэ спатрэбіцца.

Пашкоджаную, дробную або з дрэннай храпкай капусту адпраўляем на закваску. Астатні ўраджай складваем на вуліцы пад навес і даём паляжаць гадзін 12—20, у залежнасці ад надвор'я. Гэта неабходна для таго, каб гародніна трошкі падсохла, што палегчыць працу ў далейшым і падоўжыць тэрмін захоўвання.

Лепш за ўсё захоўваць капусту, вядома, у склепе. Вільготнасць павінна быць высокая, а тэмпература 1—2 градусы. Тады і гніць ураджай будзе менш, і ніякія хваробы не прычэпяцца. Склеп павінен быць дагледжаным — чыстым, апрацаваным вапнай.

Цяпер выбіраем адзін з прапанаваных спосабаў:

Самы просты — засыпаць усе качаны ў вялікую скрыню. Храпкі пры гэтым неабходна абрэзаць пад самы карэньчык. Самае галоўнае сачыць, каб паветра магло вольна цыркуляваць паміж гародніной. Эфектыўнасць такога спосабу не вельмі высокая, але лянівыя гаспадары часта яго выкарыстоўваюць.

Крыху лепш выглядае варыянт з захоўваннем гародніны на драўлянай платформе, зробленай з дошак з зазорамі паміж імі. Збіваем хуценька такі памост, на 5—7 см вышэй за ўзровень падлогі, і выкладваем на ім качаны. Капусту выкладваць неабходна пірамідай. Гэта значыць, ніжні слой вялікі, другі зверху меншы, трэці — яшчэ меншы і гэтак далей, пакуль на вяршыні не застанецца адна капусціна. Спосаб добры тым, што паветра пастаянна цыркулюе, а дрэнны тым, што калі захочаце ўзяць нейкі канкрэтны, падгніўшы качан, то ўся канструкцыя можа абрынуцца.

Працягвае топ простых спосабаў — захоўванне на паліцах. Палічкі размяшчаюцца па ўсёй даўжыні сцяны ў склепе на адлегласці дыяметра самага буйнога качана.

Дапамагае захоўваць свежую капусту стары «знаёмы» — пясок. Можна перасыпаць гародніну пяском тут жа ў скрынках, можна насыпаць пясок у кораб або на падлогу і паўтыкаць у яго качаны. Гэта выдатна падыходзіць для таго, каб захаваць усе ўласцівасці капусты, не даць ёй захварэць або загніць у хуткім часе.

Адзін з самы простых, праверaных і якасных метадаў — ахінуць кожны качан капусты ў некалькі газет ці іншую паперу. Метад апрабаваны тысячамі агароднікаў. Усе кажуць, што папера нават дапамагае захоўваць капусту ў халадзільніку, не кажучы ўжо пра захаванасць ураджаю ва ўмовах склепа.

Напрыканцы два найбольш эфектыўныя спосабы захавання. Першы заключаецца ў шчыльным загортванні кожнай капусціны ў харчовую плёнку. Для гэтага трэба абрэзаць качаны ўровень з галавой капусты, абматаць кожны ў некалькі слаёў плёнкай. Чым танчэй плёнка, тым больш слаёў. Рукамі абціскаюць яе, каб усё было шчыльна. Гэта сапраўды цудоўны метад, які дазволіць захаваць абсалютна ўсю гародніну да пасявання свежай капусткі. Другі —падвешванне капусты за храпку да столі склепа. Для гэтага спатрэбіцца вяроўка, доўгія храпкі, некалькі тоўстых дошак, прыбітых да столі склепа, цвікі і востры нож. Наразаем вяроўкі рознай даўжыні, ад метра да 50 сантыметраў, на адлегласці 20 см адзін ад аднаго убіваем ў дошку цвікі (гэта можна зрабіць яшчэ да мацавання дошкі да столі). Прывязваем адзін канец вяроўкі да храпкі, а другі — да цвіка. Такім чынам падвешваем увесь ураджай капусты. Плюсаў мноства — захаванне карыснай прасторы склепа, зручнасць выкарыстання (адрэзаў вяроўку — забраў дадому), цыркуляцыя паветра і іншыя.

■ Крымінал

НА БРАГУ ВЫВЕЎ «БУСЕЛ»

Супрацоўнікі УУС Мінаблвыканкама і Мінскага абласнога ўпраўлення МНС упершыню выкарысталі беспілотны лятальны апарат «Бусел — М» для выяўлення схаваных у лесе падпольных самагонных вытворчасцяў.

